ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам) „Прафрух“

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адзаку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 31 сакавіка 1930 г. № 75 (3583) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

УРАД ТЭРОРУ І ВАЙНЫ

Урадавы крызіс у Польшчы скончыўся, пасьля доўгіх адціжак і ўсялякіх манэўраў з боку Пілсудзкага, стварэньнем новага габінэту па чале з лідэрам фашысцкага блёку палкоўнікам Славэкам.

Склад новага габінэту гаворыць аб тым, што ён сфармаваны з самых выразных і агрэсыўных фігур фашысцка-палкоўніцкай клікі. Прэм'ер-міністар палкоўнік Славэк зьяўляецца найбольш ваяўнічым пілсудчыкам і не адзін раз у сваіх выступленьнях выказваўся за поўную ліквідацыю ўсіх рэштак соймавых дэкарацый, за стварэньне «ўраду моцнай рукі». Ўслед за прэм'ерам Славэкам ідуць — фактычны дыктатар Польшчы Пілсудзкі, як міністар вайсковых спраў, міністар унутраных спраў—вядомы сваімі правакацыйнымі антысавецкімі выступленьнямі — Юзэфскі, міністар працы —палкоўнік Прыстар, міністар юстыцыі—Цар, які зноў вярнуўся на гэты пост і які зьяўляецца вядомым пагромшчыкам рэвалюцыйнага і нацыянальна - вызваленчага руху і інш. Новы габінэт, такім чынам, выяўляе сабою яшчэ больш завостраную, яшчэ больш адкрытую ваенна - фашысцкую дыктатуру.

Усё, што адбывалася ў Польшчы ў часе ўрадавага крызісу і створаны новы габінэт гаворыць паперм аб тым глыбокім эканамічным і палітычным крызісе, які перажывае Польшча, аб унутраным крызісе, які перажывае польскі фашызм. Эканамічнае становішча Польшчы катастрафічна пагаршаецца. Гаспадарчы крызіс завастраецца з кожным днём. Расьце беспрацоўе, важнейшыя галіны прамысловасьці, за выключэньнем вайсковай, працягваюць згортвацца. Сельская гаспадарка б'ецца ў ціскох крызісу. Цікава, што апошні камунікат «Польскага інстытуту краёвай гаспадаркі» за люты месяц прымушаны адкрыта прызнаць, што становішча гаспадаркі ня толькі пагаршаецца, але што бліжэйшыя месяцы, месяцы, якія звычайна прыносілі некаторае сэзоннае паляпшэньне, не абяцаюць нічога добрага і супакойваючага. Стабілізацыя трапічыць па ўсіх швох. У выніку фашысцкага панаваньня — гаспадарка краю знаходзіцца ў тупіку вастрэйшага крызісу.

Глыбокі гаспадарчы крызіс, узрастаючае ў сувязі з ім беспрацоўе, голад і абяднеьне найпырэйшых мас рабочае клясы, працоўнага сялянства спрыяць нарастаньню рэвалюцыйных настояў і ўзросту актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры і сацыял - фашызму. Уплывы кампартыі растуць сярод працоўных мас. Незадаваленьне мас выліваецца ў радзе вострых выступленьняў — рабочых і сялянскіх дэманстрацыях у гарадох і вёсках, у крывавых сутычках з паліцыяй, у забастовачнай барацьбе. Адбываецца пястрыманы рэвалюцыйны ўздым, які паносіць усё больш магутныя ўдары па фашысцкай дыктатуры.

Увесь фашысцкі лягер, пачынаючы ад яго палкоўніцкага крыла і канчаючы на ППС, шукаюць выхаду з тупіку.

Унутраныя спрэчкі ў фашысцкім лягеры, спрэчкі паміж паасобнымі яго часткамі, выяўленьнем якіх у апошні час зьявіўся канфлікт паміж урадам і соймам, зьяўляюцца адным з праяўленьняў агульнага абвостранага крызісу, які перажывае фашызм, і шуканьне найлепшых мэтадаў выхаду з гэтага крызісу, задушэньня рэвалюцыйнай барацьбы мас, для падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Прадыяўлены Пілсудзкім ультыматум сойму, урэшце, стварэньне ўраду Славэка—Пілсудзкага — ураду адкрытай ваенна-мілітарысцкай фашысцкай дыктатуры гаворыць аб тым, што фашызм ідзе па шляху далейшага завастрэньня дыктатуры і зьнішчэньня нават тых фікцый парлямантарызму, якія існавалі дагэтуль у выглядзе сучаснага сойму. Соймавая апазыцыя, якая гістэрычна крычала аб «абароне дэмакратыі», пагражала картоннымі мячамі «барацьбы» за ліквідацыю «майскай сыстэмы» — капітулявала цалкам. Клясычная ў сваім родзе «немое» пасяджэньне сойму з надзвычайнай яскравасьцю пацьвярджае, што ППС і ўсе «апазыцыйныя» партыі, якія зьяўляюцца непадзельнаю часткаю фашысцкага лягеру — ня толькі ня думаюць аб якімнебудзь супраціўленьні новаму габінэту фашысцкіх палкоўнікаў, ня толькі ня думаюць аб абароне соймавых дэкарацый, але актыўна дапамагаюць і будуць актыўна дапамагаць новаму ўраду ў правядзеньні ўсёй яго палітыкі. Толькі правыя апартуністы маглі лічыць, і лічаць што паміж ППС і фашызмам існуе барацьба, што ППС знаходзіцца паміж двух агнёў — фашызмам і камунізмам, што ППС'аўская левая дэмагогія зьяўляецца «вострай на абодвы бакі зброяю», якая адным сваім канцом скравана супроць камунізму, а другім супроць фашызму. Гэтыя наскрозь апартуністычныя тэорыі аб ППС, як аб «трэцяй сіле» ўшчэнт разьбіваюцца ўсім ходам падзей у Польшчы, а ў даным выпадку ўсім ходам і разьвіцьцём апошняга ўрадавага крызісу і адносінамі ППС да новага габінэту.

Ясна, што ППС, як і іншыя сацыял-фашысцкія партыі, будзе карыстацца яшчэ больш шырокай «радыкальнай» фразэалёгіяй, будзе ўжываць усялякія «левыя» гэсты і манэўры. Але ўсё гэта будзе рабіцца ў мэтах актыўнай дапамогі фашызму, у мэтах укрыцьця ад мас сапраўдных плянаў фашысцкае дыктатуры, у мэтах разьбіцьця рэвалюцыйнай барацьбы рабочае клясы, у мэтах і падрыхтоўкі вайны супроць СССР. ППС усё больш зрастаецца з фашысцкім апаратам, ППС усё больш адкрыта становіцца паліцэйска - штрэйкбрэхэрска-фашысцкай бандаю на паслугах панучай мілітарысцка - фашысцкай зграі.

Польскі фашызм шукае выхаду з унутранога крызісу ў падрыхтоўцы вайны супроць СССР, у захопе вялікіх рынкаў Савецкай Беларусі і Украіны, у імпэрыялістычнай экспансіі на Ўсход. Паміж ліхаманкавай ваеннай і палітычнай падрыхтоўкай антысавецкай вайны і стварэньнем новага габінэту Славэка—Пілсудзкага існуе поўная і самая цясьнейшая сувязь. У імкненьні панучай дыктатуры вызваліцца, нават, ад фармальнай і вонкавай залежнасьці соймавага кантролю над ваеннай, фінансавай і замежнай палітыкай ураду, зусім відавочна выступае ажыцьцяўленьне авантурыстычных і імпэрыялісцкіх плянаў польскіх фашыстых. Польскі фашызм, які разгортвае ў апошні час шалёную антысавецкую кампанію, шукае імённа ў вайсковых авантурах вырашэньня цяжкага ўнутранога становішча. Створаны новы габінэт палкоўніка Славэка, які сам ня раз выступаў за неабходнасьць агрэсыўнай палітыкі ў адносінах да СССР, зьяўляецца габінэтам далейшага абвастрэньня антысавецкай палітыкі, габінэтам далейшага ўзмацненьня вайсковых падрыхтовак.

У сваіх заявах, у дні ўрадавага крызісу, той-жа Славэк гаварыў аб «складаным абстаноўцы», якая пастойліва патрабуе стварэньня «ўраду цьвёрдай рукі». Пілсудзкі ў сваім ультыматуме сойму асабліва падкрэсьлівае, што «ўмовы» патрабуюць, каб «узмацняўся рэжым, які дабіўся таго, што пытаньні, якія раней вырашаліся ў 10 дзён, зараз вырашаюцца ў 10 мінут». Урэшце, іменна ў апошнія дні, якраз у дні ўрадавага крызісу, уся фашысцкая прэса перапоўнена артыкуламі, спэцыяльнымі перадавіцамі аб становішчы ў СССР. Што гэта ўсё азначае, аб чым усё гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што польскі фашызм, які перажывае ўнутраны крызіс і знаходзіцца ў тупіку гаспадарчага крызісу, які стаіць перад абліччам магутнага нарастаньня рэвалюцыйнай хвалі — бачыць у вайне супроць СССР адзіны спосаб вырашэньня гэтага крызісу. Ясна, што ППС і ўсе сацыял і нацыянал-фашысцкія партыі актыўна дапамагалі і будуць актыўна дапамагаць падрыхтоўцы антысавецкай вайны. Апошняя перадавіца пэпэсэўскай газэты «Роботнік» імкнецца нацыфіцкай балбатнёй прыкрыць гэту ваенную ліхаманку, але ў гэтай нацыфіцкай балбатні лепш за ўсё відна падрыхтоўка вайны. Чым бліжэй да вайны — тым больш размоў і балбатні аб міры, тым актыўней пускаюць сацыял - фашыстыя нацыфіцкі пыл у вочы масам.

Новы габінэт зьяўляецца габінэтам вайны, крызісу і белага тэрору. Зьяўляючыся чарговым выданьнем фашысцкага ўраду — ён яшчэ больш яскрава і адкрыта будзе ажыцьцяўляць палітыку тэрору, жорсткага прыгнечаньня шырокіх мас і падрыхтоўкі антысавецкай вайны.

У адказ на стварэньне габінэту працоўныя масы Польшчы, Заходняя Беларусі і Украіны, пад кіраўніцтвам кампартыі Польшчы, адкажуць яшчэ большым узмацненьнем рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашысцкай дыктатуры і яе апоры — сацыял і нацыянал - фашыстых. Працоўныя Польшчы, З. Б. і З. У. адкажуць узмацненьнем сваёй барацьбы супроць ваенных плянаў Пілсудзкага, у абарону Савецкага Саюзу. Узрастаючую рэвалюцыйную хвалю ня спыніць ні тэрор, ні «левая» дэмагогія сацыял і нацыянал - фашыстых. Рэвалюцыйная хваля будзе расьці з пястрыманай сілай, ідучы да рашучых баёў за рэвалюцыйнае зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры — за ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту.

Працоўныя БССР пазнаюць узмацніць сваю чуласьць і баявую гатоўнасьць. Усякім ваенным авантурам, усякім спробам напасьці на нашу мірную працу працоўныя СССР, разам з Чырвонай Чырвонай арміяй, пад кіраўніцтвам кампартыі, дадуць руйнуючы адпор. Разьвіваючы сацыялістычнае будаўніцтва, змагаючыся за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, праводзячы бальшавіцкую пасеўную кампанію, змагаючыся за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за суцэльную калектывізацыю сельскае гаспадаркі і па яе падставе — ліквідацыю апошняй апоры міжнароднага імпэрыялізму ў СССР — кулацтва, як класы, —мы будзем гэтым самым умацоўваць нашу магутнасьць, нашу абароназдольнасьць, узмацняць сілы міжнароднага рэвалюцыйнага пралетарыяту.

Нацружанае міжнароднае становішча, а асабліва становішча ў Польшчы, стварэньне ў ёй новага габінэту, настойліва патрабуе ад усіх нас пільнасьці, гатоўнасьці і баявых тэмпаў сацыялістычнай працы.

Генэральная праверка падрыхтоўкі да сяўбы

Ня толькі выяўляць недахопы,

але і безадкладна іх ліквідаваць

Вакол пасеўнай кампаніі разгортваецца жорсткая клясавая барацьба.--Рашучы ўдар па кулаку, які спрабуе дэзарганізаваць палявыя работы

Да перамогі на засеўным фронце

Генэральная праверка ў поўным разгары. Значная частка раёнаў мабілізавала ўсе свае сілы да правядзеньня гэтай адказнай работы. Арганізаваны рабочыя брыгады, прыцягнуты партыйны актыў і ўсё гэта кінута ў калгасы, у сяло для непасрэднага вывучаньня сапраўднай гатоўнасьці месц да веснавой засеўнай кампаніі.

У гэтым ужо першы станоўчы і важны вынік генэральнай праверкі. Яна дала штуршок да большага прыцягненьня ўвагі грамадзкасьці да хворых пытаньняў пасеўнай кампаніі. Яна садзейнічала выяўленьню памылак, недахопаў і іх безадкладнаму выпраўленьню. Ва ўчарашшым нумары «Зьвязды» надрукавана вельмі характэрная ў гэтых адносінах тэлеграма з Дубровенскага раёну (Аршаншчына). Рабочыя брыгады, якія выехалі ў калгасы, выкрылі рад буйнейшых зрываў у падрыхтоўцы да веснавой кампаніі. Высьветлілася, што лічбы, якія даваліся раней райземаддзелам, не адпавядалі сапраўднасьці. У многіх калгасах коні ня толькі не абагулены, але нават ня ўлічаны. Рабочыя пляны складзены ў незначнай частцы калектыўных гаспадарак. Нездавальняча з кормам. Не ўстаноўлены формы аплаты працы. Наўкола зямляўпарадкаваньня і падрыхтоўкі да непасрэднага выхаду ў поле ідзе жорсткая клясавая барацьба. Аднак, агітацыі кулакоў за зрыў засеву, за выхад з калгасаў проціпастаўлена вельмі слабая работа партыйных ячэек і груп беднаты. У некаторых сельсаветах работнікі замяшаліся. І ўсё гэта, ня гледзячы на баявыя настроі большай часткі беднаты, якая з вялікай энэргіяй рыхтуецца да засеву.

Малюнак становішча ў раёне вельмі цяжкі. У наяўнасьці рад буйнейшых памылак, промахаў. Стварылася РЭАЛЬНАЯ пагроза засеву ў Дубровеншчыне.

Аднак, поўнае выяўленьне становішча мабілізавала ўсю партыйную і савецкую грамадзкасьць раёну. Увесь раённы актыў выехаў на месцы. Ва ўсе сельсаветы тэрмінова пасланы зямляўпарадкавацелі і аграномы. У пасьпешным парадку рамантуецца інвэнтар. Пачата вялікая работа па хутчэйшым абагуленьні рабочае жывёлы ў калгасах, стварэньні кармавых фондаў і па складаньні рабочых плянаў. Робіцца ўсё магчымае для максымальнага скарыстаньня кароткага тэрміну, які застаўся да засеву.

Наша партыя нікоўі не ўтойвала памылак, недахопаў, якія здараліся ў паасобных вучастках нашага гаспадарчага будаўніцтва. Наша партыя заўсёды загадзя сыгналізавала аб небясьпеках і пагрозах. Наша партыя заўсёды прыкоўвала ўвагу рабочае клясы, бяднякоў - серадняцкіх пластоў вёскі да вучасткаў, якія пад пагрозаю. І ў гэтым яе сіла, не магутнасьць. У гэтым адна з прычын нашых вялікіх перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Сыгналізуючы аб небясьпеках, партыя своечасова ліквідуе іх.

Гэтага на жаль, не разумеюць паасобныя работнікі. Дырэктыву партыі аб безадкладным выпраўленьні перагібаў яны лічылі некім адступленьнем, некай здачай заваяваных пазыцый. Замест таго, каб адразу ўзяцца за выпраўленьне памылак, замест таго, каб быць на чале гэтае справы, яны супраціўляюцца правядзеньню апошніх дырэктыў партыі. Гэта скарыстоўвае клясавы вораг, які прыкладае ўсе намаганьні да развалу калгасаў знутры. Ствараецца недапушчальнае становішча, калі ня нашы работнікі, ня нашы арганізацыі растлумачваюць важнейшыя партыйныя дакументы, а кулак і падкулачнікі, якія скарыстоўваюць гэта ў сваіх шкодных мэтах.

Да чаго прыводзіць такая павольнасьць у выпраўленьні памылак, паказвае практыка быхаўскіх раённых арганізацый. Тут, як падае раённая праверачная камісія, райком доўгі час таптаўся на месцы і не ажыцьцяўляў апошніх дырэктыў партыі. У выніку мы маем зрыў падрыхтоўкі да засеву, зрыў калгаскага будаўніцтва. У раёне калгасамі фактычна захоплена 16 проц. сялянскіх гаспадарак у той час, як быхаўскія арганізацыі апэравалі лічбай у 65 проц. Абагулена толькі 6,5 проц. рабочае жывёлы. Складзеныя рабочыя пляны нікуды ня вартыя і іх прыходзіцца перарабляць. Падрыхтоўка індывідуальнага сэктару не разгорнута. Новы закон аб с.-г. падатку, калі і папулярызаваўся, дык гаварылі толькі аб ільготах калгасам.

А між тым, у раёне ёсьць усе ўмовы для пасьпяховага разьвіцьця калгаснага будаўніцтва. Аб гэтым сьведчыць наступны факт: шмат сялян—бяднякоў і сераднякоў, якія выйшлі з калгасаў, зноў падалі заявы аб жаданьні перайсьці да вбагуленых форм вядзеньня сельскае гаспадаркі.

У процівагу Быхаўшчыне мы можам адзначыць практыку Камарынскага раёну. Тэлеграма раённай камісіі адзначае, што ў выніку хуткага выпраўленьня гэрагібаў пачаўся новы прыліў беднякоў і сераднякоў у калгасы. Падаюць заявы ня толькі выбыўшыя нядаўна з калгасаў, але таксама многія сяляне, якія раней адмаўляліся ад уступленьня ў калгасы. 22-га сакавіка ў раёне пачаўся засеў. Ужо выйшлі ў поле калгасы з агульнай плошчай у 37.000 гэкт.

Зараз пасеўная кампанія ўступіла ў адказнейшы перыяд. Праз некалькі тыдняў да плянавых работ прыступяць усе акругі рэспублікі. Вось чаму зараз асабліва неабходна безадкладнае выпраўленьне і выяўленьне памылак. Вось чаму зараз асабліва патрэбна рашучая барацьба з усімі, хто марудзіць і супраціўляецца правядзеньню апошніх дырэктыў партыі.

Тэлеграма з Харкава паведамляе, што па 29 акругах Украіны калгасамі ўжо засеяна 1.600.000 гэкт. Гэта буйнейшая перамога на фронце калгаснага будаўніцтва. Гэта выразны паказальнік правільнасьці генэральнай лініі. Гэта новы ўдар па прароцтвах прэвых апартуністых, якія нявераць у посьпех нашага сацыялістычнага наступленьня.

БССР атрымае такія-жа перамогі. Яна гэтага дасягне ў выніку неаслабнай барацьбы з правымі апартуністымі і «левымі» загібамі, якія фактычна граюць на руку клясаваму ворагу. Яна гэтага дасягне, мабілізаваўшы ўсе сілы, усю энэргію на ліквідацыю асобных прарываў, асобных недахопаў.

Памылкі выпраўляюцца

У Жыткавіцкім раёне (Мазыршчына) 32 калгасамі ахоплена 3.820 гэкт. плошчы раёну — 26 проц. усіх гаспадарак. 60 проц. калгасаў ужо пераведзены на новы статут.

У раёне быў дапушчаны рад перагібаў пры правядзеньні калектывізацыі і раскулачваньня. 4 сераднякі былі індывідуальна ападатканы і маемасьць іх канфіскавана, у калгасах абагульвалі ня толькі асноўныя сродкі вытворчасьці, але ўсякую дробную жывёлу, як сьвіней, авечак і птушак. Пры арганізацыі калгасаў некаторыя працаўнікі ўжывалі пагрозы і запалохваньні сялян.

Зараз усе гэтыя перагібы і скажэньні выпраўляюцца. Раскулачаным серадняком вернута маемасьць. Сакратар ячэйкі ў в. Вятчын зьнят з работы і прыцягваецца да адказнасьці. Іншыя працаўнікі, вінаватыя ў перагібах, прыцягваюцца таксама да адказнасьці.

У раёне раскулачана 115 гаспадарак. 59 проц. плошчы калгасаў ужо зямляўпарадкавана. Што датычыцьць індывідуальных гаспадарак, якія не ўвайшлі ў калгас, дык ім плошча яшчэ не адведзена. Зараз у вёскі пасланы каморнікі для вызначэньня правага кліну індывідуальным бяднякам - серадняцкім гаспадаркам.

Калгасы абагулілі насеньне ў разьмеры 55 проц. патрэбы. Сельска - гаспадарчымі прыладамі калгасы забясьпечаны поўнасьцю.

27-га сакавіка пры РВК была склікана нарада старшынь калгасаў, на якой абмяркоўваўся плян арганізацыі выхаду ў поле, правільнага разьмеркаваньня і скарыстаньня цягавай і рабочай сілы. Устаноўлена зьдельная аплата працы па 4-хразрадным тарыфнай сетцы, ад 60 кап. да 1 руб. 20 кап.

Плян пашырэньня пасеўнай плошчы да паасобнага індывідуальнага бяднякам - серадняцкага двара не даведзены. Зараз у сельсаветы выехалі ўпоўнаважаныя РВК і аграномы для папулярызацыі ільгот па новым законе аб с.-г. падатку, за пашырэньне пасеўнай плошчы і правядзеньне агра і зоамінімуму.

Калгасьнікі энэргічна рыхтуюцца да сяўбы і даюць рашучы адпор кулацкім спробам перашкодзіць калгасам выйсьці ў поле для правядзеньня веснавой сяўбы.

РАЁННАЯ ПРАВЕРАЧНАЯ КАМІСІЯ.

3.300.000 РУБЛЕЎ НЕСКАРЫСТАНЫХ КРЭДЫТАЎ

Паводле даных Беларускай канторы Калгасбанку, на 20-га сакавіка па крэдытнай сыстэме БССР засталося каля 3.300.000 рублёў, якія вызначаны на крэдытаваньне мерапрыемстваў па засеўнай кампаніі ў калгасах. Прычым, па аднэй толькі Магілеўскай акрузе суцэльнай калектывізацыі сума нескарыстаных крэдытаў складае каля паўтара мільёна рублёў.

Ня прыходзіцца гаварыць аб тым, што такога становішча з крэдытаваньнем пельга далей цярпець. Затрыманьне крэдытаў у крэдытнай сыстэме і нявыдача іх калгасам да гэтага часу (а ў нас пачынаецца ўжо сяўба) зьяўляецца проста злачынствам.

НКЗ БССР гэтымі днямі даў катэгарычную дырэктыву мясцом зараз-жа прасунуць крэдыты непасрэдна да засеўчыкаў. Раённыя праверачныя камісіі павінны зацікавіцца таксама і пытаньнем скарыстаньня крэдытаў на мерапрыемствы па засеўнай кампаніі, выяўляючы ўсе канкрэтныя выпадкі затрыманьня крэдытаў крэдытнай сыстэмай.

Л. Н.

Не разумеюць значэньня новага статуту

Па Рэчыцкім раёне налічваецца 31 калгас на плошчы 46.997 гэкт. На новы статут пераведзена 47 проц. калгасаў. Некаторыя кіраўнікі затрымліваюць пераход калгасаў на новы статут, «баючыся выхаду з калгасаў». Гэта паказвае на тое, што яны зусім не разумеюць значэньня пераводу на новы статут, які зьяўляецца найлепшым сродкам для замацаваньня посьпехаў калектывізацыі.

Да гэтага часу арганізаваны 14 батрацка - бяднацкіх груп. Добра працуюць батрацка - бяднацкія групы ў калгасах імя 10-годзьдзя БССР, Леніна, «Савецкая Беларусь» і імя Сталіна. Батрацка - бяднацкія групы гэтых калгасаў здолелі завастрыць увагу ўсяе беднаты і калгаснага актыву на падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

У сувязі з давядзеньнем апошняй дырэктывы партыі і ўраду да калгаснікаў беднякоў і сераднякоў у апошні дні назіраецца прыліў у паасобныя калгасы.

ПРАВЕРКОМ.

КАЛГАСЫ КАРАЛІНШЧЫНЫ І ТУРАЎШЧЫНЫ ПАЧАЛІ СЯЎБУ

Паводле атрыманых зводак, у паўднёвых раёнах БССР, якія мяжуюць з Украінай, пачалася сяўба. Першым выйшаў у поле саўгас «Слабада». За ім пачалі сяўбу 4 калгасы ў Тураўскім раёне і 5 калгасаў у Каралінскім раёне. Апошнімі ў першы дзень палявых работ, фактычна пробных, засеяна 30 гэкт. аўсу і 15 гэкт. канюшыны.

Калгасьнік ЮХНЕВІЧ з калгасу імя Дзяржынскага за спраўнае трыманьне с.-г. машын атрымаў прэмію. Цяпер яго абралі старшынёй сельсавету.

Перабудаваліся на-ходу

У Сіроцінскім раёне калектывізавана 1127 гаспадарак — 13,7 проц. Усе калгасы ўжо пераведзены на новы статут с.-г. арцелі. Зараз каморнікі ўдарным парадкам канчаюць зямляўпарадкаваньне калгасаў, прыступлена да зямляўпарадкаваньня індывідуальных бяднякам-серадняцкіх гаспадарак, якія не ўвайшлі ў калгасы.

Пры зацьвярджэньні новага статуту выпраўлены перагібы ў адносінах абагуленьня дробнае жывёлы. Дапушчаныя ў раёне перагібы ў адносінах індывідуальнага абкладаньня сераднякоў таксама выпраўлены.

Кармамі, насеньнем і інвэнтаром калгасы забясьпечаны. Алчуваецца недахоп у цягавай сіле, жалезе, насеньні гародніны, канюшыны і вікі.

На 5-га сакавіка вызначаны пробны выхад у поле 10 калгасаў.

Перабудоўваюцца пляны абслугоўваньня індывідуальнага сэктару крэдытам, насеньнем, інвэнтаром.

Раён на хаду пераключыўся да непасрэднай падрыхтоўкі да сяўбы паводле апошніх дырэктыў партыі і ўраду.

РАЁННАЯ КАМІСІЯ.

ТАПТАЛІСЯ НА МЕСЦЫ

ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ НЯ ВЫКОНВАЛІСЯ

Раённая камісія, прыступіўшы да праверкі падрыхтоўкі да сяўбы ў раёне, выявіла, што ні адна з раённых установаў ня мае дакладных вестак аб ступені падрыхтаванасьці да сяўбы.

Аднак, тыя даныя, якія ўжо ёсьць у праверачнай камісіі, дазваляюць зрабіць вывад, што ход падрыхтоўкі да сяўбы як у калгасах, так і ў індывідуальным сэктары надзвычай дрэнны.

Паводле афіцыйных вестак быхаўскіх установаў на 20 сакавіка налічвалася 65,8 проц. калектывізаваных гаспадарак. Па даных-жа праверачнай камісіі, на 27 сакавіка ў раёне фактычна налічвалася 16 проц. калектывізаваных гаспадарак.

Такая значная разьбежка ў лічбах тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што раённыя арганізацыі бралі лічбы аб калектывізацыі са столі. Яны акрамя таго, лічылі калгасамі тыя вёскі, дзе не вялося ніякай растлумачальнай работы і якія пад адміністрацыйным націскам прымалі пастановы аб арганізацыі калгасу. Нічога дзіўнага няма ў тым, што зараз у раёне наглядаецца даволі значны адліў з калгасаў. Аднак, трэба адзначыць, што ў тых мясцох, дзе праводзіцца новы статут, апошнімі часамі наглядаецца і процілеглае зьявішча: частка тых, якія вышлі з калгасаў, зноў падаюць заявы аб уступленьні ў калгасы.

Вялікай перашкодай у справе замацаваньня калектывізацыі ў раёне зьяўляецца тое, што Быхаўская райпартарганізацыя несваячасова і не рашуча разгарнула работу па зыпраўленьні перагібаў. Аб гэтым сьведчыць хоць-бы наступны факт: з існуючых 39 калгасаў па новы статут пераведзены толькі 18.

У сувязі з выхадам з калгасаў, з аднаго боку, і з уступленьнем часткі тых, якія раней падалі заявы аб выхадзе, з другога боку, прыходзіцца ўвесь час калгасы зямляўпарадкоўваць нанаво. Гэтым тлумачыцца тое, што па 27-га сакавіка па раёне зямляўпарадкавана толькі 23 проц. плошчы калгасаў.

У гонцы за процантамі калектывізацыі быхаўскія арганізацыі зусім выпусьцілі з-пад сваёй увагі неабходнасьць арганізацыйнага замацаваньня калгасаў. У выніку гэтага мы маем такое становішча, што па калгасах раёну абагулены толькі 6,5 проц. рабочае жывёлы.

З прычыны паўстойлівага складу калгасаў, складзеныя рабочыя пляны страцілі сваю вартасьць і зараз прыходзіцца іх зноў перарабляць. Але гэта яшчэ ня зроблена. Зусім нераспрацавана пытаньне аб формах аплаты працы калгасьнікаў. Райкалгасгасаюз абсалютна не спраўляецца са сваёй работай. Замест практычнай дапамогі і жывога кіраўніцтва ён займаецца пісаньнем шматлікіх паперак. Работа па правядзеньні весчавой пасеўнай кампаніі сярод індывідуальных сялянска - серадняцкіх гаспадарак яшчэ не разгорнута. Новы закон аб сельска - гаспадарчым падатку, калі і растлумачваўся, дык толькі ў напрамку папулярызацыі ільгот калгасам.

Ня гледзячы на тое, што праз ніколькі дзён у Быхаўшчыне ўжо пачнецца сяўба, адвод правога кліну тым бяднякам - серадняцкім гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў калгас, ва кананы ня больш чым на 50 проц.

У выніку ўсяго гэтага пашырэньне пасеўнай плошчы індывідуальным сэктарам знаходзіцца пад пагрозай.

Аднэй з асноўных прычын таго становішча, якое стварылася ў Быхаўшчыне, зьяўляецца надзвычай дрэнная пастаноўка працы сярод беднаты. Групы беднаты арганізаваны толькі 6 калгасах, але і тыя не працуюць.

Райком, замест таго, каб своячасова выправіць свае памылкі і давесьці апошнія дырэктывы партыі і ўраду да асноўных мас сялянства, некаторы час таптаўся па месцы і не ажыцьцяўляў дырэктыў партыі. Гэта вырыстоўваў кулак, які разгарнуў шалёную агітацыю супроць калектывізацыі.

Старшыня праверкому СТРЭЛЬ[illegible]

АД РЭДАКЦЫІ: [illegible] што партыйна-савецкае кіраўніцтва раёну [illegible] давало яго да такога становішча, [illegible] здольна ажыцьцяўляць дырэктывы партыі і павінна быць абвешчана.

Тэлеграма Чэрвеньскаму РВК

Генэральная праверкай падрыхтаванасьці да сяўбы выяўлена, што ў некаторых калгасах Чэрвеньскага раёну ўстаноўлена падзённая аплата калгасьнікаў. Тэрмінова прымеце меры да пераводу іх на зьдельшчыну.

Старшыня Праўленьня Менакркалгасаюзу ФЛЕЕР.

Хто вінаваты ў зрыве выробу запасных частак

Завод імя Ланцуцкага ня выконвае ўзятых на сябе абавязацельстваў

Учора Гомельская акруговая праверачная камісія паведаміла, што па віне Белсельгасснабу зрываецца выраб часьцей да трактараў. Гомельскі паравозны завод імя Ланцуцкага да гэтага часу ня мае мадэляй, шаблёнаў і чарцяжоў трактарных частак.

У сувязі з гэтым, рэдакцыя [illegible] накіраваны спэцыяльны супрацоўнік у Белсельгасснаб для высьвятлення справы. У Белсельгасснабе нашаму супрацоўніку паведамілі наступнае:

3-га сакавіка «Белсельгасснаб» заключыў дагавор з гомельскім заводам імя Ланцуцкага на выраб трактарных частак да трактараў «Фордзон» і «Фордзон-цілавец» на суму 200.000 руб. Завод павінен быў зараз-жа прыступіць да выкананьня заказу.

Паводле [illegible] Наркомтяжпрому СССР кіраўніцтва выробам трактарных часьцей, за бесьпячэньнем мадэлямі, чарцяжамі, [illegible] ўскладзена на завод «Чырвоны піліраўшчык» у Ленінградзе. Завод імя Ланцуцкага павінен быў своячасова [illegible] Ленінградзе з «Чырвоным Пуціловцам» [illegible] патрабаваць ад яго належных мадэляй і чарцяжоў. Аднак, завод гэтага не зрабіў, і пакуль што да выробу трактарных частак фактычна яшчэ не прыступілі.

Другі пункт дагавору паміж заводам і «Белсельгасснабам» кажа, што «заводам да атрыманьня патрэбных матар'ялаў прыступае да выробу частак з матар'ялаў уласных запасаў». Яшчэ зусім нядаўна дырэктар заводу імя Ланцуцкага т. Хімакоў паведаміў «Белсельгасснабу», што з уласных запасаў матар'ялаў завод зможа выкананць 40 проц. заказу і што з 11 сакавіка ўжо прыступлена да выробу трактарных частак.

Але 26 сакавіка той-жа т. Хімакоў [illegible] па ў «Белсельгасснаб» адносіну, у якой паведамляе, што завод ня можа прыступіць да выкананьня заказу, з прычыны адсутнасьці належных матар'ялаў. У чым-жа справа? Чаму-ж за такі кароткі тэрмін становішча з матар'ялаў [illegible] выробу трактарных частак [illegible] нілася. Гэта невядома [illegible] снабу», ні нам.

Вядома толькі, што 11 сакавіка завод фактычна прыступіў да выробу [illegible] трактарнага корпуса, але гэтая аказалася нягодным. Ён быў зроблен [illegible] чальна на [illegible]. Матар'ял-жа з якога быў зроблен поршань, прызнаны [illegible] ным. Такім чынам, справа [illegible] і [illegible] ніадзе, а ў нядобрасумленным [illegible] ваньні завода імя Ланцуцкага [illegible] на сябе абавязацельстваў.

Акруговыя камісіі паведамляюць

БАБРУЙСКАЯ АКРУГА

НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

Бабруйская акруговая камісія па праверцы падрыхтоўкі да сяўбы выявіла, што падрыхтоўка па акрузе праходзіць нездавальняюча. Абмежаваньне зямлі для калгасаў яшчэ ня скончана. У большасьці калгасаў рабочыя пляны ня складзены. Таксама і з арганізацыяй працы ў калгасах.

Не хапае насеньня тэхнічных культур і траў, якія сабраны ў калгасах толькі ў разьмеры 40 проц.

З прычыны нядбайнасьці Белкалгасцэнтру і Белпаляводсаюзу арганізацыю насенаводных і лугавых гаспадарак у акрузе можна лічыць сарванай *)

Адсутнасьць належных крэдытаў перашкаджае стварэньню кармавое базы на ўвесь час веснавое сяўбы. *)

Два дні таму назад атрымана новае распараджэньне Белкалгасцэнтру аб арганізацыі машына-конных станцый, але дакладных інструкцый яшчэ няма. Яны яшчэ друкуюцца ў выдавецтве.

Індывідуальны сэктар выпаў з-пад увагі акруговых устаноў. Акрэмаддзел толькі 10-га сакавіка даў дырэктыву па гэтым пытаньні.

Акрпаляводсаюз аб абслугоўваньні індывідуальнага сэктару зусім ніякіх дырэктыў ня даў.

Плян завозу с.-г. машын выкананы ў разьмеры 50 проц. Машыны, якія завезены ў акругу, разьлічаны выключна на індывідуальны сэктар.

Бабруйская акруговая камісія.

*) Ад рэдакцыі: мы чакаем тэрміновага адказу ад:

1. Бабруйскай акруговай праверачнай камісіі—у чым канкрэтна выявілася нядбайнасьць Белкалгасцэнтру і Белпаляводсаюз

Кангрэс працоўнага сялянства

Працоўнае сялянства Эўропы возьме прыклад з сялян СССР

Палёт на пасяджэньне кангрэсу сац.-дэмакратычных малайцоў 25 дэлегатаў арыштавана

АРЫШТ У ДАРОЗЕ 2-х ДЭЛЕГАТАЎ АД ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

БЭРЛІН, 28. Дэлегаты раду краёў, які выступалі ў спрэчках на сёньнішнім пішнім пасяджэньні эўрапейскага сялянскага кангрэсу, выказалі поўнасьцю ўсвядомленую неабходнасьць цеснага саюзу працоўнага сялянства з пралетарыятам у барацьбе з аграрнай буржуазіяй, фінансавым капіталам, капіталістычнай дзяржаваю, фашызмам і сацыял - фашызмам і за самавызначэньне ўціснутых нацыянальнасьцяй, супроць каталістычнай рацыяналізацыі ў сельскай гаспадарцы, за абарону Савецкага саюзу і рабоча - сялянскі ўрад. Дэлегаты сялян Югаславіі, Румыніі, Грэцыі і Венгрыі не змаглі зьявіцца на кангрэс прычыны рэпрэсій з боку ўрадаў гэтых краёў. Два дэлегаты ад Заходняй Беларусі арыштаваны ў дарозе. 7-мі ангцускім дэлегатам адмоўлена ў дазволе на ўезд. 70 процантаў дэлегатаў працоўных сялянаў, а іншыя зьяўляцца парляманцкімі дэпутатамі ад сялян або актыўнымі работнікамі сялянскіх арганізацый. Звыш ¾ удзельнікаў кангрэсу — беспартыйныя.

Цэнтральным момантам вячэрняга пасяджэньня 29 сакавіка Усеэўрапейскага сялянскага кангрэсу было выступленьне пралетаўніка Сялянскага Інтэрнацыялу т. Нікалеты, які заявіў, што Сялянскі Інтэрнацыянал у агульным згаджаецца з патрабаваньнямі кангрэсу. Тав. Нікалеты адзначыў, што кангрэс склікан у патрэбны момант, калі ўзрастаючы націск новага эканамічнага крызісу выклікае стыхійныя паўстаньні сялянскіх мас супроць эксплёватацыі і калі адбыўся раскол унутры, так званых, сялянскіх партый і сялянскіх саюзаў. Сялянскі Інтэрнацыянал у агульным ухваляе прадстаўленую делегатамі кангрэсу пляцформу а некалькімі, аднак, агаворкамі. Нельга адмовіць, што ў некаторых тэзісах пляцформы месціцца адзінак шкодных забабонаў, якія трэба зьнішчыць.

Перад прамоваю т. Нікалеты, выступаўшыя ў спрэчках прамоўцы абмалявалі становішча змагаючагася працоўнага сялянства

У часе прамовы польскага дэлегата ў памяшканьне кангрэсу ўварвалася паліцыя. Пачалася праверка дакумантаў. Нямецкі дэлегат, які быў за старшыню на пасяджэньні, пратэставаў супроць гэтых дасьпеньняў сац.-дэмакратычнага паліцэй - прэзыдэнта Цэргібеля. Пасьля 2-хгадзіннае надзвычай старанай праверкі дакумэнтаў паліцыя арыштавала 25 дэлегатаў і пераслала іх у паліцэй-прэзыдыум з тае прычыны, што ў іх, быццам, няма дакумантаў.

Копія „Усходняга Інстытуту“

Як паведамляе польскі фашысцкі часопіс, польскі ўрад прыступае зараз да здзяйсьненьня пляну стварэньня ўкраінскага навуковага інстытуту ў Львове.

ГЭТЫ «ІНСТЫТУТ» БУДЗЕ КОПІЯЮ НЯДАЎНА АРГАНІЗАВАНАГА «УСХОДНЯГА ІНСТЫТУТУ» Ў ВІЛЬНІ І БУДЗЕ МЕЦЬ НА МЭЦЕ ПАДРЫХТОЎКУ КОНТР - РАЗЬВЕДЧЫКАЎ ДЛЯ «НАВУКОВЫХ» ПРАЦАЎНІКОЎ ВАДДЗЕЛУ ГЕНШТАБУ ДЛЯ РАБОТЫ НА ТЭРЫТОРЫІ САВЕЦКАЕ УКРАІНЫ.

Гэты новы крок яшчэ лішні раз пацьвярджае захопніцкія пляны польскага фашызму у адносінах да Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі і гаворыць пра ЗМАЦНЕНЬНІ ВАЙСКОВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СУПРОЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ.

Характэрна, што гэты інстытут, які ствараецца з поўнай узгодненасьцю, а нават па ініцыятыве украінскіх нацыянал - фашыстых, ствараецца ня ў Львове, не ў Заходняй Украіне, А Ў ВАРШАВЕ.

Гэты новы правакацыйны манэўр польскага фашызму і украінскага нацыянал - фашызму мае таксама на мэце стварэньне ў Польшчы нейкага сурагату, які можна было-б процістаўіць Савецкай Усеукраінскай Акадэміі Навук.

Новая правакацыя польска - украінскага фашызму выклікала шырокія пратэсты з боку працоўных мас Заходняй Украіны.

Як паведамляе «Газэта Варшавска», № 83, гэтымі днямі ў Львове адбыліся шматлікія мітынгі пратэсту і дэманстрацыі ўкраінскай рэвалюцыйнай моладзі супроць стварэньня «украінскага навуковага інстытуту».

ПРОЦАС „СВУ“.

ФАЛЬШЫВЫЯ „СПОВЕДЗІ“, ДВУДУШНЫЯ „ПАКАЯНЬНІ“

Пыт падсудных Чарняхоўскага, Гэрмайзэ, Іваніцы

ХАРКАЎ, 27. Пасьля Кудрыцкага на лаву дапытваецца падсудны Чарняхоўскі, прафэсар Кіеўскага Медыцынскага Інстытуту. Чарняхоўскі арганізаваў медыцынскую групу СВУ і кіраваў ёю. Апрача таго, Чарняхоўскі выконваў дзеньні цэнтру СВУ за мяжой. Падтрымліваючы сувязь з эміграцыкімі контр - рэвалюцыйнымі арганізацыямі гэтага Чарняхоўскі выкарыстоўваў навуковыя камандыроўкі заграніцу.

Пракурор т. Міхайлік старасціна выясьняе, якія іменна даручэньні выконваў Чарняхоўскі за мяжой. Выяўляецца, што на даручэньні Яфрамава ён шаснаццаць высьветліць пытаньні аб магчымасьці адзінага эміграцкага фронту.

Пракурор тав. Міхайлік пытаецца яго: «Вы былі адным з тых, хто выконваў работу па аб'яднаньні контр-рэвалюцыйных сіл мясцовых і зарубежных?»

— Ясна,—адказвае Чарняхоўскі

Перад заканчэньнем допыту Чарняхоўскі робіць суду такую заяву: «Я прызнаю, што я быў да апошняга часу контр-рэвалюцыянэрам. Цяпер я асуджаю гэту маю палітычную дзейнасьць».

Суд пераходзіць да допыту Гэрмайзэ Гэта адна з самых выдатных фігур працэсу. З 1925 году ён быў адным з кіраўнікоў ВУД, а з 1926 па 1929 год членам прэзыдыуму СВУ. Гэрмайзэ не шкадуе чорных фарбаў для «самакрытыкі, для інтэлігенцкага самабічаваньня і хоча ў што-б там ні стала выявіць сябе, як сапраўднага грэшніка. Характарызуючы контр-рэвалюцыйную дзейнасьць СВУ, падсудны кажа, што адной з галоўных арганізацый контр-рэвалюцыі была школа імя Шэўчэнка, другой—Акадэмія Навук, трэцяй—частка ўкраінскай інтэлігенцыі, чацьвертай—украінская праваслаўная аўта-кэфальная царква. Гэта зьмяшчае адрозьнівацца ад іншых тым, што іменна праз царкву контр-рэвалюцыйная інтэлігенцыя мела ў руках культ. Гэрмайзэ яўна прабуе ўменшыць сваё значэньне і сваю ролю ў СВУ. Ён выставляе сябе мала актыўным і нават «нейтральным» членам гэтай арганізацыі. Гэрмайзэ таварыць, што спачатку ён лічыў СВУ адзіным нацыянальным фронтам, але потым зразумеў, што ідэйная неабходнасьць гэты фронт абарочваецца ў фронт нацыяналістычнай контр-рэвалюцыі

Грамадзкія абвінаўачэньні тав. Любчанка пытае: «Якая партыя пала Польшчы ўкраінскіх контр-рэвалюцыянэраў?»

— Украінская сацыял-дэмакратыя дала Пятлюру Гэтым усё сказана—адказвае Гэрмайзэ.

ХАРКАЎ, 29. 27-га сакавіка Вярхоўны суд на справе «СВУ» скончыў допыт падсудных Гэрмайзэ.

Гэрмайзэ зноў прабуе палашь сваю контр-рэвалюцыйную работу ў нявінных фарбах. Ён заяўляе што часта нават шкадаваў пра тое, што ў акадэміі няма камфракцыі, якая-б магла ажыцьцявіць пралетарскі кантроль. Яўна контр-рэвалюцыйную «маладую» акадэмію Гэрмайзэ называе ледзь не савецкай арганізацыяй, якая аднак, працавала.. канспырацыйна. Падсудны лічыць сябе вінаватым толькі ў тым, што садзейнічаў контр-рэвалюцыі і, як член «СВУ», улываў на моладзь не ў савецкім напрамку.

Стараючыся выгарадзіць сябе. Гэрмайзэ заяўляе што ўжо з 1924 году ў яго пачаліся разыходжаньні з Яфрэмавым. Ён нават парваў з ім навуковую сувязь і паслаў яму рэзкі ліст. Аднак, дапытаны Яфрэмаў заяўляе, што ён ніякага разыходжаньня не прыкмячаў і ніякага ліста ад Гэрмайзэ не атрымаў. У канцы допыту Гэрмайзэ заяўляе што ён асуджае «дваістасьць» сваё пазыцыі, асуджае сваё мінулае і быў-бы шчасьлівы, калі-б яму далі магчымасьць давесьці гэта ня толькі на словах, але і на справе.

Суд пераходзіць да допыту падсудзнага прафэсара Іваніцы, члена «СВУ», які праводзіў контр-рэвалюцыйную работу праз педагагічную групу гэтае арганізацыі. Іваніца расказвае суду аб тым, як навукова-педагагічнае таварыства, намесьнікам старшыні якога ён быў абярнулася ў контр-рэвалюцыйную арганізацыю, якая рыхтуе на заданьнях «СВУ» кадр людзей «на выпадак зьвяржэньня савецкае ўлады».

У часе допыту Іваніцы, у суд паступіла заява аб тым, што падсудны быў у свой час членам саюзу рускага народу.

Далей суд дапытвае падсуднага Догу, члена «СВУ», пастаўніка школы імя Шаўчэнкі. Дога прызнае, што ён быў школьнікам на культурным фронце, што ён перашкаджаў камуністычнаму ўплыву ў галіне педагагічнае думкі і практыкі і ўсіляк перашкаджаў таксама прыёму на курсы камсамольцаў.

ЗАГАТОВІНЬ 7 МЛН. ПУДОЎ БУЛЬБЫ

Увосень мінулага году пастаўка бульбы, дзякуючы ўдзелу ў гэтай кампаніі шырокіх мас працоўных як горагаду, так і вёскі, прайшла з посьпехам. Мы змаглі загатовіць каля 16 млн. пуд., з якіх 6 млн. пудоў былі вывезены ў буйнейшыя пралетарскія цэнтры СССР для забесьпячэньня рабочых.

Зараз веснавы час, г. зн. з сакавіка па май нам трэба загатовіць мінімум 7 млн. пуд., з якіх 2,5 млн. пуд. павінны быць вывезены ў іншыя раёны СССР як для сяўбы, так і для забесьпячэньня рабочых.

Усе экаманічныя паказальнікі гавораць за тое, што гэты плян зьяўляецца рэальным. Трэба толькі пачаць выкладзе восені правесьці арганізавана гэту загатоўку, упягнуць у гэту кампанію шырокія масы працоўных і бяднака-серадняцкую масу вёскі. Трэба, каб гэты загатоўшчык і кожны сельскі ўлічыў сабе ўсю значнасьць сваячасовага выкананьня гэтага пляну.

Больш 50 проц. загатовак павінна быць накіравана на незадаволеньне сваёчасовай кампаніі як у БССР так і ў СССР. Адсюль зразумела, што запатрэбаньне загатовак зрабіце сваячасовай, пад'ем асабліва важна цяпер, калі бульба зьяўляецца адным з асноўных прадуктаў як для прамысловасьці так і для забесьпячэньня працоўных.

Тое, што мы абавязаны забясьпечыць засеўным матар'ялам бульбы пашыраную засеўную плошчу ў БССР, ускладае на нас зараз абавязак поўнасьцю і дакладна выявіць нашы патрэбы ў бульбе для засеву, а рэшту сваячасова вывезьці для патрэб гарадоў.

Усялякія разважаньні аб неабходнасьці пакінуць бульбу «пра запас, а можа на хоўць», шкодна адаб'ю на забесьпячэньні бульбай іншых раёнаў СССР, што зусім недапушчальна.

Праверка мінулага году гаворыць нам, што бульбы ў нас ёсьць у патрэбнай колькасьці для поўнага выкананьня пляну, трэба толькі ўсю загатоўку правесьці сваячасова.

Трэба зараз-жа ўзяцца за гэту справу сур'ёзна, ва ўдарным парадку. Трэба зараз-жа праверыць, як дасягнуты плян загатовак бульбы да асноўнага калгасу і вёскі, што робіцца на месцах для яго выкананьня. Кожны калектыў, кожная вёска абавязаны прымаць удзел у выкананьні гэтага пляну. Кулацкім гаспадаркам павінны быць зараз-жа даны цьвёрдыя заданьні

Асноўныя БССР павінны пішчэ раз давесьці [illegible]еньне пабальшавіцку [illegible] загатовак.

АБРАМСОН.

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б

Аб ходзе калектывізацыі і засеўнай кампаніі

(З дакладу т. ГАЛАДЗЕДА)

Справа калектывізацыі і падрыхтоўкі да веснавой засеўнай кампаніі.—пачынае тав. Галадзед,—зараз зьяўляецца асноўнай у рабоце нашай партарганізацыі.

Вынікі калектывізацыі на сёньнішні дзень гаворыць аб тым, што палітыка нашай партыі, якая накіроўваецца на максімальна-магчымыя тэмпы індустрыялізацыі краіны, калектывізацыю і арганізацыю буйных савецкіх гаспадарак, зьяўляецца адзіна правільнай палітыкай.

Толькі дзякуючы гэтай палітыцы партыі калектывізацыяй зараз ахоплены мільённыя масы бяднякоў--серадняцкага сялянства. Гэта дало нам магчымасьць паставіць і вырашыць важнейшую і асноўную палітычна-гаспадарчую задачу—замяніць вытворчасьць кулацкай гаспадаркі вытворчасьцю буйной калектыўнай гаспадаркі. ажыцьцявіць задачу ліквідацыі кулацтва, як клясы. Дасягненьнямі ў галіне калектывізацыі мы яшчэ раз давялі шкоднасьць правааапартуністычнай тэорыі і практыкі. Наша задача ў далейшым ні на крыліну не паслабляць змаганьня з правымі як у тэорыі, так і на практыцы.

Найбольш высокі процант калектывізацыі па БССР мы маем на 1 сакавіка, пасьля чаго паступова, аж да 20 сакавіка, мы маем зьмяншэньне гэтага процанту.

Чым тлумачыцца гэтае зьявішча?

Першае—некаторы процант трэба скінуць на папраўку ў сувязі з тым, што раней у авоўках з месц давалася шмат дутых лічбаў—стараліся паказаць больш процант калектывізацыі, чым гэта было на справе.

Зараз,—адзначае тав. Галадзед,—адносіны да лічбаў па калектывізацыі некалькі лепшыя. Таварышы на мясцох пачалі адносіцца да гэтай справы больш сур'ёзна ў сувязі з артыкулам тав. Сталіна «Головокружение от успехов» і пастановай ЦК УсеКП(б), у якой папярэджвалася аб змаганьні за выпраўленьне тых перагібаў у гэтай справе, якія наглядаліся на мясцох.

Другой прычынай упаду крывое калектывізацыі зьяўляецца тое, што ў сувязі з перагібамі пры калектывізацыі частка бяднякоў-серадняцкага сялянства, асабліва серадняцкага, выйшла з калгасаў.

6-та студзеня 1930 году ЦК УсеКП(б) была дана дырэктыва аб недапушчальнасьці бюракратычнага дэкрэтаваньня калектывізацыі зьверху, аб недапушчальнасьці гульні ў калектывізацыю.

Асноўнае, што падкрэсьлівалася ў гэтай дырэктыве—недапушчальнасьць парушэньня прынцыпу добраахвотнасьці пры аб'яднаньні сялянскіх гаспадарак у калгасы.

Ці ўсюды правільна зразумелі гэтыя дырэктывы нашай партыі? Не, далёка ня ўсюды.

У радзе месц замест таго, каб разьвіць глыбокую палітычную работу па падрыхтоўцы да калектывізацыі бяднякоў-серадняцкіх мас, лічылі за лепшае толае адміністраванне ў справе калектывізацыі шляхам загадаў, пагроз, арыштаў і нават раскулачваньня паасобных сераднякоў. Праводзілі калектывізацыю з недапушчальным і нават злачынным парушэньнем прынцыпу добраахвотнасьці і скажэньнем лініі нашай партыі. Вось некалькі прыкладаў:

У Гомельскай акрузе, у вёсцы Васільлеўка, Цэрахаўскага раёну па сходзе дзе прысутнічала больш 300 сялян, некаторыя члены партыі ў спрэчках выказаліся так: «мірным шляхам мы ўсё роўна нашых сялян у калектыў ня ўцягнем. Трэба пазбавіць ня ўступіўшых у калгас паявых кніжак, не даваць пасеньня і наогул прыняць рад іншых мер адміністрацыйнага парадку, толькі тады нашы дзядзькі пойдуць у калгас».

У Пусімльскім сельсавеце, Клімавіцкага раёну, Магілёўскай акругі, былі арыштаваны 5 бяднякоў і сераднякоў, якія адмовіліся ўступіць у калгас, і пакуль справа была разглядзана, яны некаторы час сядзелі пад арыштам. Між іншым, гаворачы наогул, Клімавіцкі раён гэта той раён, які першым калектывізаваўся на 100 проц. Справа калектывізацыі там прайшла лепш, чым у іншых раёнах і акругах. У гэтым раёне мы маем шмат і добрых прыкладаў калектывізацыі. Там ёсьць значная група зусім моцных калгасаў. Але і ў гэтым лепшым на Беларусі раёне таксама, як вы бачыце, у паасобных сельсаветах былі агідныя выпадкі.

Далей тав. Галадзед падаваў некалькі аналёгічных прыкладаў з другіх раёнаў акругі, якія выразна гаварыць аб тым, што ў радзе месц справа калектывізацыі была пастаўлена паасобнымі галавацямі на няправільны шлях і дырэктывы партыі спачатку да канца скажаліся.

Многія працаўнікі на мясцох ня ведалі, што яны арганізуюць—ці таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі ці арцелі, ці камуны. Яны ня імкнуліся вывучаць статуты адпаведнай ступені калектыву з тым, каб дасканала растлумачыць іх селяніну. А адсюль і вынікаюць базадказныя перакоснкі з арцелі проста ў камуну, хоць для гэтага і ня было ў радзе месц належных умоў. Бо калі-б самі таварышы, якія праводзяць калектывізацыю, ведалі, што яны арганізоўваюць, дык яны бязумоўна не заганялі-б усіх курак у адну пуню, бо кожная форма калгасу мае свой узровень абагуленьня маемасьці і сродкаў вытворчасьці. Адсюль, ад гэтага неразуменьня і вынікае самае галавацяпскае абагуленьне ўсіх і ўсяго ўключна да птушак. У справах абагуленьня ёсьць грэх ня толькі мясцовых органаў, але і некаторых нашых цэнтральных установаў. Напрыклад, пад выглядам змаганьня з разбазарваньнем жывёлы наш НКГандлю даў дырэктыву калгасыстаме, каб абагульвалі «племянную» птушку. А Калгасцэнтр і малочна-жывёлагадоўчы саюз адразу паслалі дырэктыву безадкладна абагуліць ўсю птушку ў арганізаваных і малочных быць арганізаванымі калгасамі. НК Аховы Здароўя прапанаваў забараніць продаж з вазоў сала і масла «ў мэтах санітарнага нагляду».

У сувязі з супальнай калектывізацыяй, якая разгортваецца, на гэтай падставе партыя і абвясьціла лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы. Асноўным мэтадам ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу павінна быць калектывізацыя.

У радзе месц гэта зразумелі наадварот раскулачваньне зрабілі мэтадам калектывізацыі, а ня масавую калектывізацыю—падставай раскулачваньня. У радзе выпадкаў раскулачваньне праводзілася самым агідным чынам—аж да простае дзяльбы кулацкай маемасьці. Разам з гэтым ёсьць і рад іншых фактаў, якія гаворацьь аб тым, што правай практыкі пры праведзеньні раскулачваньня было ў нас на мясцох столькі, што хоць адбуляй. Гэта правая мазьня,—кажа тав. Галадзед,—была, зразумела на руку кулаку, яна дэзарганізавала батрацтва, беднату і сераднякоў. Былі факты і другога парадку, факты выразных перагібаў і проста злачынных дасяньняў, калі пад «левымі» фразамі паасобныя працаўнікі раскулачваньне пашыралі на паасобных сераднякоў і беднякоў.

Перагібы і скажэньні лініі партыі былі на руку кулаку, ускладнялі палітычныя настрої ў серадняцтва і перашкаджалі справе калектывізацыі.

Пытаньне аб работе з батрацтвам і беднатой ёсьць адно з важнейшых палітычных пытаньняў. У гэтай важнейшай рабоце нашай партыі на вёсцы ва многіх выпадках у нас была мазьня. У большасьці раёнаў работе з батрацтвам і беднатой, пытаньню ажыцьцяўленьня работы бяднацкіх груп не налавалася ніякай увагі. Зразумела, што такія адносіны да важнейшай арганізацыйна-палітычнай задачы нашай партыі на вёсцы зьяўляюцца апартунізмам самага горшага тыпу. Некаторыя таварышы ігнаруюць працэс клясавага змаганьня на вёсцы, думаючы, што з кулаком справа ўжо скончана і што пытаньне аб клясавым змаганьні на вёсцы зараз ужо «ўрэгулявана». Адсюль іменна і недаацэнкас работы з батракамі і беднатой. Такія разважаньні зьяўляюцца палкам памылковымі, шкоднымі і паскроль апартуністычнымі. Таварышы, якія так разважаюць, забыліся, што мы толькі што зрабілі першы крок па шляху ліквідацыі кулацтва, як клясы, і што якраз зараз клясавае змаганьне з кулаком набывае самыя вострыя формы. Кулак зараз аказвае самае лютае супраціўленьне.

Нам трэба.—заклікае тав. Галадзед—узмацніць работу з беднатой у калгасах, узмацніць саюз гэтай беднаты з серадняком і даць рашучы бой кулаку

Тав. Сталін на 14-м зьезьдзе УсеКП(б) сказаў: «серадняк—гэта чалавек ваганяючы. Ён глядзіць, хто пераможа, чакае і толькі тады, калі ты пераможаш, скіне абшарніка і буржуазію, ён ідзе з табою ў саюз. На тое ён і серадняк». Гэта фармулёўка на сёньнішні дзень застаецца на 100 проц. правільнай, аб ёй ня трэба забываць.

Хістаньне серадняка канкрэтна выявілася ў паасобных выпадках разбору агульнай маемасьці (пасевы, жывёла і інш.) у адзіне паасобных груп сераднякоў з калгасаў і г. д. У некаторых акругах БССР гэта «хварэла»—хістаньне ўжо ці айшла. Там мы ўжо маем новыя прыклады сераднякоў у калгасы. Рашучае выпраўленьне перагібаў і памылак, разьвіцьцё энэргічнай работы па арганізацыі груп беднаты і батрацтва пры ўмацненьні саюзу беднаты з серадняком, пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе партыі, і рашучы адпор кулаку, які імкнецца выкарыстаць хістаньні серадняка—усё гэта зьяўляецца галоўным сродкам, каб паслабіць і спыніць гэтае хістаньне.

Пытаньне аб выпраўленьні дапушчаных перагібаў і памылак зьяўляецца тагім пытаньнем, на якое трэба сканцэнтраваць зараз асноўную сваю ўвагу. Ня ўсюды зразумелі дырэктыву партыі аб неабходнасьці безадкладнага выпраўленьня дапушчаных перагібаў. У нас яшчэ шмат выпадкаў калі да гэтага часу дыскусуюць артыкул тав. Сталіна. Людзі забываюць дырэктыву партыі. Такія выпадкі былі ў Шклове. Бяда ў тым, што ва многіх мясцох думаюць таксама, як думаюць у Шклове. Нават і ў цэнтры ў нас вы пачуеце такія разважаньні, што артыкул т. Сталіна, праўда добры, але ён позна зьявіўся, што дырэктыва ЦК УсеКП(б) зьяўляецца перагледам лініі па калектывізацыі, адступленьнем назад. Ад чаго-ж адступаць? Ад таго, што многія галавацяпы рабілі перагібы і гэтыя перагібы ўзьвялі ў лінію партыі. Ні ў адной дырэктыве ЦК УсеКП(б) няма пункту аб тым, каб дапушчаць перагібы. Наадварот, на ўсіх ранейшых дырэктывах па калектывізацыі ЦК УсеКП(б) зусім выразна прадпісваў ад таго, каб ня гулялі ў калектывізацыю, не дэкрэтавалі бюракратычна калектывізацыю зьверху, каб захавалі прынцып сапраўднай добраахвотнасьці пры аб'яднаньні ў калгасы. Партыя будзе і далей біць самым рашучым чынам па ўсіх тых, хто пад прыкрыцьцём левае фразы творыць правыя справы. Наша задача—своячасова руйнуючы ўдарыць па спробах правых апартуністых выкарыстаць перагібы і скажэньні лініі партыі для апраўданьня сваёй апартуністычнай лініі. Некаторыя таварышы прабуюць нашу цьвёрдую ўстаноўку на безадкладнае выпраўленьне перагібаў тлумачыць і праводзіць у жыцьцё ў такім сэнсе—раз загалваюць папраўляць, дык станавіся на чале раздачы абагуленай маемасьці, разбазарваньня калгасаў. Трэба на хаду выпраўляць памылкі, але ні на хвіліну не паслабляць працы і наадварот, у тысячу разоў узмацняючы працу на замацаваньні калгаснага будаўніцтва, па яго далейшым разьвіцьці на падставе генэральнай лініі нашай партыі.

Спыняючыся на канкрэтных пытаньнях аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, тав. Галадзед адзначыў, што веснавая засеўная кампанія бягучага году зьяўляецца адным з рашаючых моментаў як нашай гаспадарчай палітыкі, так і замацаваньня тых вынікаў калгаснага будаўніцтва, якія мы маем да гэтага часу. Вось такое важнасьці і значэньня засеўнай кампаніі многія не разумеюць. Пытаньне з абагуленьнем насеньня і пягавай сілы ў калгасах, як асноўных элемэнтаў якія забясьпечваюць пасьпяховае праведзеньне засеўнай кампаніі, стаіць у нас зусім дрэнна. Мы павінны гэтае пытаньне завастрыць, як сьлед, перад усімі партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі. Трэба падкрэсьліць безадкладнасьць працы на складаньні гаспадарчых плянаў у калгасах, па разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі і саўгасамі. Мы павінны выкарыстаць час, што застаўся да сяўбы, каб пакласьці зямлю калгасамі адвесьці яднаны клін не ўвайшоўшым у калгасы індывідуальным бяднацка-серадняцкім гаспадаркам. Гэта зараз асноўнае і галоўнае.

У індывідуальным сэктары яшчэ горшая падрыхтаванасьць да пачатку сяўбы, чым у калгасным сэктары. Асабліва дрэнна з адводам яраваго кліну індывідуальным, не ўвайшоўшым у калгас, бяднацка-серадняцкім гаспадаркам. Існуе недаацэнка значэньня індывідуальнага сэктару. Гэты грах ёсьць ня толькі на мясцох, але і ў нас, у цэнтры.

Цэнтрам работы ўсіх арганізацый зьяўляецца канцэнтрацыя ўвагі на арганізацыйнымі і гаспадарчым замацаваньні ўжо арганізаваных калгасаў, і на гэтай падставе мы павінны і далей цьвёрда ісьці наперад па шляху папаўненьня калгаснага будаўніцтва. Максымальную ўвагу трэба зьвярнуць на пытаньні арганізацыі работы ў калгасах, адыходнічтва і шырокае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва. Другой палітычнай задачай зьяўляецца самае энэргічнае, безадкладнае і пастойлівае выпраўленьне дапушчаных скажэньняў і перагібаў пры калектывізацыі на падставе артыкулу т. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б). Необходна даць самы рашучы адпор усім тым разважаньням, якія прабуюць трактаваць гэтыя правільныя дырэктывы партыі, як адыход назад, як перагляд лініі партыі на калектывізацыю.

Трэба забясьпечыць яравы клін поўнасьцю насеньнем як па калгасным, так і па індывідуальным сэктары. Трэба выканаць плян арганізацыі машына-конных станцый, рамонт інвэнтару, абагуленьне да пачатку сяўбы ўсей цягавай сілы ў калгасах, зьвярнуць належную ўвагу на адвод зямель як калгасам, так і бяднацка-серадняцкім гаспадаркам, якія не ўвайшлі ў калгас. Трэба ўжыць рэальныя захады для ажыцьцяўленьня пастаноў бюро ЦК і СНК аб разьвіцьці жывёлагадоўлі Максымальную ўвагу трэба зьвярнуць на праведзеньне засеўнай кампаніі ў саўгасах, маючы на ўвазе, што ня можа і не павінна застацца незасеяным ніводнага кавалачка зямлі ні ў сацыялістычным сэктары, ні ў індывідуальным.

ДЗЕНЬНІК ПЛЕНУМУ

Першае пасяджэньне

Вечарам 27-га сакавіка пачаў свае работы пленум ЦК КП(б)Б.

У парадку дня два пытаньні:

1) Аб ходзе калектывізацыі і аб пасеўнай кампаніі.

2) Аб выкананьні прамфінпляну.

Першае пасяджэньне пленуму было цалкам прысьвечана дакладу тав. Галадзеда па першым пункце парадку дня.

Дзеньнік пленуму ЦК КП(б)Б

(Пасяджэньне другое)

СПРЭЧКІ ПА ДАКЛАДУ т. ГАЛАДЗЕДА

Спрэчкі, якія разгарнуліся па дакладу т. Галадзеда, былі накіраваны, галоўным чынам на мабілізацыю ўвагі ўсіх партарганізацый у змаганьні з перагібамі — асноўнай перашкодай далейшых посьпехаў разьвіцьця і замацаваньня калгаснага руху. Факты грубейшых скажэньняў лініі партыі ў пытаньнях калектывізацыі, якія мелі месца ў радзе раёнаў і аб якіх гаварылі таварышы з месц, сьцьвярджалі настойлівую патрэбнасьць самага рашучага змаганьня з памылкамі, скажэньнямі і перагібамі ў справе калектывізацыі, змаганьня як з «левымі» загібамі, так і асабліва з яўна правай апартуністычнай практыкай.

Яўнае і захаваньне супраціўленьне ўстаноўкам партыі ў палітыцы на вёсцы, даным у артыкуле т. Сталіна, лісьце УсеКП(б) і пастанове ЦК КП(б)Б, знайшло сваё найбольш тыповае аллюстраваньне ў так званай «шклоўшчыне». Гэтае супраціўленьне антыпартыйных апартуністычных элемэнтаў павінна быць ліквідавана рашуча і хутка.

Вось гэтыя пытаньні складаюць зьмест спрэчак.

Тав. Новікаў у сваім выступленьні падкрэсьліваў невыстарчальную увагу ў радзе месц да якаснага гаспадарча-арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў. Гналіся за лічбамі і мала думалі пра замацаваньне выпікаў. Ён падае выпадак, калі адзін з работнікаў, камандураваных у раён на дапамогу калектывізацыі, прабаваў перамагчы ўсе труднасьці штрафамі. Галоўнае — выправіць зробленыя памылкі і перагібы, без чаго немагчыма праведзеньне бальшавіцкай сяўбы.

Тав. Манжалей паказваў на факты недапушчальна слабое ўвагі работе з беднатою і батрацтвам і нават на наяўнасьць паасобных выпадкаў, калі батракоў ня прымалі ў калгас. Паказальнікам слабога выкананьня дырэктыў ЦК аб работе сярод беднаты і батрацтва зьяўляецца ўцягненьне батракоў у калгасы толькі на 31%, а па некаторых акругах і [illegible] ніжэй.

Тав. Жасьмін паказваў на меўшыя месца ў Слуцкім раёне факты супраціўленьня пераходу калгасаў на новы статут.

— Гэты статут для нашага раёну не падыходзіць, — заяўлялі некаторыя работнікі, якія дагэтуль трымаліся мэтадаў адміністраваньня. У той-жа час работа з беднатою ў раёне была амаль забыта. Так, ва Ўраваніцкім сельсавеце на запытаньне аб стане работы з беднатой, работнікі адказалі: прызнаемся, што сходаў беднаты ня склікалі.

Там, дзе праводзілася работа з беднатой, дзе партыйная арганізацыя пабальшавіцку перабудавалася пасьля апошніх дырэктыў партыі, там мы маем зусім іншае становішча.

Тав. Амбражунас (Гомель) гаварыў аб тым, што пасьля праведзеных па раёнах нарад партыйныя арганізацыі энэргічна ўзяліся за выпраўленьне раду перагібаў. Гэтым трэба вытлумачыць тое, што ў Гомельскай акрузе адсеў з калгасаў параўнальна меншы за іншыя акругі. Спробы выхад у поле, праведзены ў двух раёнах, паказаў баяныя настроі ў калгаснікаў, іх арганізаванасьць і спрыяў уздыму ў іншых калгасах. Адзнэй з баявых задач у Гомельскай акрузе зьяўляецца забесьпячэньне калгасаў фуражом, на што трэба адпусьціць спэцыяльныя крэдыты калгасам.

— Арганізацыя і гаспадарчае афармленьне калгасаў — асноўнае, што зараз стаіць перад намі, — сказаў тав. Чычэраў (Віцебск). Найбольш небясьпечным зьявішчам у ажыцьцяўленьні дырэктывы партыі зьяўляецца так званая «шклоўшчына». Элэменты цікай «шклоўшчыны» ёсьць ва многіх арганізацыях. Мы сустракаемся з фактамі яўнага супраціўленьня дырэктывам ЦК.

Трэба даць магчымасьць калгасам правесьці самаачыстку ад яўна варожых і шкодніцкіх элэмэнтаў. Гэтае мерапрыемства дасьць калгасам толькі карысьць і ўзьніме іх аўтарытэт.

Тав. Астапенка (Бабруйск), паказваючы на меўшую месца антыпартыйную алозву Рагачоўскага райкому, патрабуе самым рашучым чынам ударыць па скрыўленьнях і перагібах у ажыцьцяўленьні палітыкі партыі. Трэба ўзмацніць увагу да індывідуальнага сэктару ў веснавой сяўбе, што часта забываюць.

Тав. Калнін (ЦКК) падаў рад канкрэтных фактаў, якія паказваюць як ня трэба падыходзіць да калектывізацыі. Быў выпадак, калі адзін з работнікаў па калектывізацыі заявіў: «я сёньня арганізаваў 4 калгасы, а па дарозе дадому яшчэ адзін арганізаваў»! Ёсьць настрої, што артыкул т. Сталіна трэба было не друкаваць, або апублікаваць яго пасьля сяўбы. Зразумела, што такія настрої выйшлі шкодныя, нічога агульнага з бальшавіцкім разуменьнем пытаньня ня маюць. Пастанова Шклоўскага райкому невыпадковая. Трэба жорстка біць на гэтых настроях, паколькі яны узбройваюць кулака і апартуністых. Далей, тав. Калнін кажа, што трэба самым рашучым чынам рэагаваць на кожны выпадак скрыўленьня партыйнай лініі ў адносінах да серадняка. На жаль, не заўсёды так бывае. Адзначыўшы рад прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы (кантрактацыя, вапнаваньне), тав. Калнін скончыў заклікам да мабілізацыі ўсіх сіл партыйных арганізацый, каб замацаваць дасягненьні ў калгасным будаўніцтве і выканаць задачы, якія партыя паставіла ў сувязі з веснавой сяўбой.

Тав. Соснін, характарызуючы становішча Клімаўшчыны, падаваў рад фактаў жорсткага клясавага змаганьня ў раёне, спробы кулакоў падкупіць беднату шляхам абяцаньня хлеба. Мелі месца выпадкі, калі кулацтва, падбухторваючы беднату на разбор абагуленага насеньня, абяцала выдаць беднаце па 2 пуды з кожнага пуда разабранага насеньня.

Правільна паказваючы на дасягненьні ў галіне калектывізацыі, тав. Соснін [illegible] на даў належную рашучую крытыку меўшых месца ў Клімаўшчыне памылак і перагібаў. [illegible] паказаў на [illegible] вільнай ацэнцы становішча і мабілізацыі ўвагі на выпраўленьне памылак.

На прыкладзе Гарадоцкага раёну тав. Сянкевіч паказвае, да чаго даводзіць адсутнасьць змаганьня са спажывецкімі настроямі. Выхаваньне беднаты праводзілася не на вытворчых прынцыпах, а на

Мацней ленінскае адзінства

Вышэй баявую падрыхтоўку

2-ая Беларуская дывізія да XX-й партканфэрэнцыі

Да XX-ай дывізійнай партыйнай канфэрэнцыі партарганізацыя дывізіі прыходзіць моцна згуртаванай. Разам з усёй партыяй, партыйная арганізація дывізіі рашуча змагалася з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, у першую чаргу з правай небясьпекай, з галоўнай на даным этапе, і прымірэнцтвам, адначасова даючы жорсткі адпор контр-рэвалюцыйнаму трацкізму і «левым» загібам.

Выкрытыя выпадкі правай практыкі і асобных зьвеньняў партыйнай арганізацыі дывізіі атрымалі жорсткі бальшавіцкі адпор з боку ўсёй партыйнай арганізацыі. Праяўленьні з боку асобных камуністых «левых» загібаў ячэйкамі хутка выкрываліся і атрымлівалі рашучае асуджэньне.

Генэральная чыстка партыйнай арганізацыі, абсьледваньне становішча дывізіі камісіяй ЦК УсеКП(б) яшчэ больш узьнялі актыўнасьць арганізацыі, павысілі аўтарытэт яе.

Паварот у палітыцы партыі—перарод ад абмежаваньня і выцісканьня дакваідацыі кулацтва, як клясы,—арганізацыйна своечасова падхоплены і тут па беларускую мову, беларусізаваны.

Палітычныя запяткі з усімі катэгорыямі вайскоўцаў поўнасьцю беларусізаваны.

Беларуская мастацкая кніга заваёўвае значна большае месца ў масе нашых чытачоў.

З кожным годам павялічваюцца кадры беларусаў. Партарганізацыя ў сваім складзе мае 72,1 проц. беларусаў. Камсамольская арганізацыя мае 89,5 проц. Начскладу—беларусаў—63,5 проц., палітскладу—71 проц. і сярод малодшага начскладу—90 проц. беларусаў.

Наша задача заключаецца ў тым, каб неадкладна быў партарганізацыямі праведзены стан беларусізацыі часьцей, пляны—ступень іх выкананьня, наколькі рэалізаваны загад Пуокра, наколькі выкананы дырэктывы акруговай нарады па нацыянальнай рабоце.

Нам трэба рабіць так, каб справа беларусізацыі дывізіі была ўзьнята на належную палітычную вышыню, каб больш сьвядомасьці мы ставілі і рашуча змагаліся са скрыўленьнямі лініі партыі ў нацыянальным будаўніцтве, не паслабляючы агню па контр-рэвалюцыйным антысэмітызьме, па беларускім нацыянал-дэмакратызьме і па шавінізьме ўсіх колераў.

Яшчэ вышэй па якасьці павінна быць пастаўлена работа па інтэрнацыянальным выхаваньні байцоў.

Вось, аб чым павінна будзе яшчэ раз з усёй рашучасьцю сказаць надыходзячая партканфэрэнцыя.

ЗЛАТКІН.

Абяцаем выканаць прамфінплян з перавышэньнем

Тэлеграма штабу сацыялістычнага будаўніцтва і кіраўніку рабочае клясы—плэнуму ЦК КП(б)Б

У часе прапрацоўкі галоўных пытаньняў па калектывізацыі і выкананьні прамфінпляну, рабочыя швэйнай фабрыкі імя Валадарскага (Магілеў) паведамляюць, што **прамфінплян 2-га кварталу выканаць поўнасьцю на ўсе 100 проц. да 12-й гадзіны дня 28-га сакавіка.**

Рэштаю рабочых дзён, да 1-га красавіка, **запауняем прарывы першага кварталу.** Абяцаем выканаць прамфінплян **з перавышэньнем.**

Адначасова вітаем правільную пастанову ВСНГБ аб пабудове гіганту-швэйнай фабрыкі ў Магілеве.

Няхай жыве камуністычная партыя—правадыр сацыялістычнага будаўніцтва!

Паводле даручэньня рабочых фабрыкі—

Сакратар парткалектыву **ГАРЭЛІК.**

Старшыня фабкому **РАКІНА.**

Дырэктар фабрыкі **БУНІМАЎ.**

Аб беларусізацыі ў 2-й дывізіі

Пытаньне нацыянальнага будаўніцтва Чырвонай арміі зьяўляецца неразрыўнай часткай нацыянальнай палітыкі партыі і савецкае ўлады. Наша 2-ая дывізія па сваім фармаваньні—дывізія нацыянальная, беларуская.

Год таму назад пастаноўка нацыянальнай работы і беларусізацыі ў дывізіі была праверана камісіяй РВС БВА.

У тэты-ж час мы мелі важнейшыя пастановы мінулай 1-ай акруговай нарады па нацыянальнай рабоце ў часьцях акругі.

У выніку праверкі Пуокра, чысткі партарганізацыі, пастаноў акруговай нарады—мы параўнальна з мінулым выгадна ўзьнялі адказнасьць і актыўнасьць партыйных арганізацый за справу выкананьня дырэктыў, пастаўленых перад намі ў нацыянальным пытаньні.

Партыйная арганізацыя дывізіі асноўным прынцыповым пытаньнем нацыянальнай палітыкі партыі разумеюць, правільна. Выразна разумеецца асноўная ўстаноўка партыі ў нацыянальным будаўніцтве, якая павінна быць пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Партарганізацыя дывізіі дала рашучы, руйнуючы адпор праяўленьням контр-рэвалюцыйнага антысэмітызму ў партыі і армії. Узьнята клясавая пільнасьць нашых часьцей і сяброў. Палепшылася работа па інтэрнацыянальным выхаваньні чырвонаармейцаў. Рашуча даны адпор праяўленьням шавінізму ўсіх колераў і беларускаму нацыянал-дэмакратызму.

Мы маем такія паказальнікі ў нашай рабоце: камандная мова ў дывізіі—беларуская. Страявыя заняткі па дысцыплінах, дзе ёсьць перакладзеныя стаўты па беларускую мову, беларусізаваны.

Палітычныя заняткі з усімі катэгорыямі вайскоўцаў поўнасьцю беларусізаваны.

Друк у дывізіі як ротны, таксама і палкавыя шматтыражныя газэты поўнасьцю беларусізаваны.

Беларуская мастацкая кніга заваёўвае значна большае месца ў масе нашых чытачоў.

З кожным годам павялічваюцца кадры беларусаў. Партарганізацыя ў сваім складзе мае 72,1 проц. беларусаў. Камсамольская арганізацыя мае 89,5 проц. Начскладу—беларусаў—63,5 проц., палітскладу—71 проц. і сярод малодшага начскладу—90 проц. беларусаў.

Наша задача заключаецца ў тым, каб неадкладна быў партарганізацыямі праверны стан беларусізацыі часьцей, пляны—ступень іх выкананьня, наколькі рэалізаваны загад Пуокра, наколькі выкананы дырэктывы акруговай нарады па нацыянальнай рабоце.

Нам трэба рабіць так, каб справа беларусізацыі дывізіі была ўзьнята на належную палітычную вышыню, каб больш сьвядомасьці мы ставілі і рашуча змагаліся са скрыўленьнямі лініі партыі ў нацыянальным будаўніцтве, не паслабляючы агню па контр-рэвалюцыйным антысэмітызьме, па беларускім нацыянал-дэмакратызьме і па шавінізьме ўсіх колераў.

Яшчэ вышэй па якасьці павінна быць пастаўлена работа па інтэрнацыянальным выхаваньні байцоў.

Вось, аб чым павінна будзе яшчэ раз з усёй рашучасьцю сказаць надыходзячая партканфэрэнцыя.

ЗЛАТКІН.

Рост партарганізацыі Беларускай дывізіі

Рост партарганізацыі паказвае тэндэнцыю да павялічэньня і праходзіць у адпаведнасьці з пастановамі лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) 1928 году.

За 1929 год партарганізацыя вырасла на 151 чал., з ліку якіх 67 проц. рабочых, 26 проц. беднякоў і рэшта—7 проц.—іншыя. Толькі за два з паловай месяцы 1930 году ў партыю прынята 68 чал., з якіх 41 рабочы. Мы за апошні год маем калектыўнае ўступленьне ў партыю чырвонаармейцаў адзяленьня палкавой школы 6 палка, чаго да гэтага часу не наглядалася.

Дзякуючы правільнаму росту, палепшыўся і сацыяльны склад партарганізацыі. Процант рабочых павялічыўся на 14,3 проц., а служачых зьнізіўся на 4,4 проц. На 90 проц. партарганізацыя вырасла за лік чырвонаармейцаў і малодшага камскладу, групы, найбольш зьвязанай з байцом.

Камсамольская арганізацыя зьяўляецца памочнікам партарганізацыі. Яна таксама расла шпаркім тэмпам. Рост у параўнаньні з мінулым годам павялічыўся на 7 проц., але гэта яшчэ лічыцца ня зусім выстарчальным. Процант прынятых рабочых таксама павялічыўся на 11 у параўнаньні з мінулым годам.

Калі ў дывізіі рост зусім здавальняючы, дык па асобных часьцях ёсьць прарывы.

Партарганізацыя дасьць свае адпаведныя паказаньні аб далейшым палепшэньні сацыяльнага складу партарганізацыі і аб ліквідацыі прарываў у асобных часьцях.

КАРОБАЧКА.

Мэліярацыя—бяспрытульны вучастак

Паляводсаюзы і АКРЗА дрэнна кіруюць мэліярацыйнымі работамі

На работах не хапае тэхнічнага пэрсаналу

Адзіце пастановы СНК БССР усе мэліярацыйныя работы былі перададзены ў Белкалгасцэнтру. Потым гэта частка мэліярацыі адышла ад апошняга загад Белпаляводсаюзу.

Наркамзем і яго акруговыя аддзелы засталося агульнае кіраўніцтва навуковымі галінамі мэліярацыі і правільнае мэліярацыйных работ, якія маюць дзяржаўнае значэньне.

Выкананьне гэтых мерапрыемстваў на мэтай лепш абслугоўваць сельскую гаспадарку, павялічыць засеўную плошчу і, побач з гэтым, ураджайнасьць. Але, на жаль, прыходзіцца канстатаваць, што мясцовыя земельныя арганізацыі да гэтае важнае работы адносяцца вельмі нядбайна. Яны ня ўлічылі ўсёй важнасьці гэтай рэарганізацыі і дугі час адклалі перадачу справы і замацаваньня гэтага тэхнічнага пэрсаналу па акруговым.

У некаторых акругах усе гэта работы ішлі 3-4 месяцы, напрыклад, па акрузе акруга разьмежаваньне функцый паміж акрэкамаддзелам і паляводсаюзам сьпачылася і юрыдычна афармілася толькі ў пачатку сакавіка месяца г. г. Мэліярацыйны пэрсанал, які мецца пры земаддзелах, на працягу імі нічога не рабіў. Ніякага кіраўніцтва ні з боку акруга, ні акрпаляводсаюзу мэліярацыйных работамі не праводзілася. Адны лічылі, што справа ад іх перайшла, і таму бяздзейнічалі, а другія ня ўжывалі ніякіх захадаў, каб прыняць справы і праводзіць канкрэтныя работы. На жаль, і пасьля юрыдычнага афармленьня перадачы мэліярацыйных справаў акрпаляводсаюзам практычнай работы няма.

Акрпаляводсаюзы яшчэ адзін момант. Пры рацыяналізацыі продукцыі ставяцца максымальна-прадукцыйнае выкарыстаньне тэхнікі і персаналу, эканомія сродкаў і маганьня з паралелізмам у работе. Між тым, ні адзін з гэтых пунктаў у новым палажэньні аб мэліярацыі не адзначаецца.

Нестача мэліярацыйнага пэрсаналу для правільнага мэліярацыйных работ не дазваляе. Мэліярацыйныя і гідра-тэхнічныя работы забясьпечаны тэхнічным пэрсаналам толькі на 20 проц., па культурнай—на 30 проц. і па здабываньню торфу — на 40 проц. Усіх гэтых аказ... ніякіх акруговых земельных аддзелах, ні акрпаляводсаюзы ня ўлічваюць, а наадварот, займаюцца драбленьнем і гэтых, зусім нязначных, тэхнічных сіл паміж сабою.

З прычыны таго, што ні Наркамзем, ні Белкалгасцэнтр не распрацавалі, на падставе пастановы СНК, практычных мерапрыемстваў па перадачы часткі мэліярацыйных работ ад земельных органаў акрпаляводсаюзам, на ўсёй гэтай справе мы маем поўную блытаніну і прыспасьбіць. Тут рацыяналізацыя выйшла «дыбам».

Для зьнішчэньня ўсёй гэтай ненармальнасьці і блытаніны канкрэтна трэба зрабіць пастаўнае: усе работы па мэліярацыі (гідратэхніцы, культуртэхніцы і па здабываньні торфу) трэба перадаць Белпаляводсаюзу і акрпаляводсаюзам, за выключэньнем вялікіх дзяржаўных работ, якія будуць весьціся арганізаванымі ўрбі НКЗ Мэліябудам. Трэба перадаць з акрза ў акрпаляводсаюз увесь без выключэньня тэхнічны пэрсанал па мэліярацыі (гідратэхніці, культуртэхніці і торфмайстры). Таксама павінен быць перададзены з Наркамзему ў Белпаляводсаюз увесь кіруючы пэрсанал па мэліярацыі, г. зн. інспэктары па гідратэхніцы, па культуртэхніцы і інспэктары па торфаздабываньні. Апрача таго, павінны быць перададзены ў сыстэму паляводсаюзу ўсе без выключэньня сродкі вытворчасьці—інструманты, прылады, крэдыты і інш.

К.

У БССР працуе 206 трактар ў

Паводле вестак НКЗямляробства, на сёняшні дзень у Беларусі працуе 206 трактараў. Па акругах трактары разьмешчаны наступным парадкам: у Менскай акрузе знаходзіцца 59 трактараў, у Віцебскай—38, у Магілеўскай—28, у Гомельскай—23, у Гомельскай—22, у Віцебскай—16, у Полацкай—16 і ў Маскоўскай—5.

Перавыбары фабкомаў папяровай прамысловасьці

НА „СПАРТАКУ"—ПРАВАЛ

ЧВЭРЦЬ РАБОЧЫХ НЕ ПРЫНЯЛА ЎДЗЕЛУ Ў ПЕРАВЫБАРАХ

ПЕРАВЫБАРЫ ТРЭБА СКАСАВАЦЬ

Ужо ў першыя дні падрыхтоўкі да перавыбараў фабкому фабрыкі «Спартак» (Шклоў, Магілеўская акруга) вызначыліся трывожныя сымптомы ў адносінах рабочых да перавыбарнай кампаніі. На пахаваньні з вымленных сходах ня было 100 проц. яўкі. У сярэднім прысутнічала каля 80 проц. рабочых. Вечар пытаньняў і адказаў, прысьвечаны перавыбарам, быў сарваны з прычыны няяўкі рабочых. Здавалася-б, што гэтыя сыгналы павінны былі адразу-ж узварушыць фабрычныя арганізацыі. Трэба было адразу-ж вызначыць асноўныя хібы пасыўнасьці больш пятай часткі рабочых і прыняць належныя меры шляхам узмацненьня палітычнай і масавай работы. Але фабрычныя арганізацыі адносьліся да гэтых фактаў казённа. Яны не мабілізавалі ўвагі рабочых, яны не паклапаціліся вывучыць прычыны пасыўнасьці значнай часткі рабочых фабрыкі.

Таму на наступных сходах, дзе абмяркоўвалася работа фабкому і намячаліся кандыдаты ў фабком, пасыўнасьць рабочых яшчэ больш узрасла. На 7-мі сходах з 430 чалавек (у той час, як на фабрыцы працуе 525 чалавек) у сярэдніх на кожным сходзе. Зразумела, што гэта ліча кажа аб незацікаўленасьці часткі рабочых работай свайго фабкому.

Характэрна таксама, што для праверкі работы фабкому спачатку запісалася 58 добраахвотнікаў, але праверку праводзілі толькі 19 чалавек. Гэта значыць, што з добраахвотнікамі не правялі належнай падрыхтоўчай работы.

Роўналежна з добраахвотнікамі правярала работу фабкому «лёгкая кавалерыя». Але і апошняя працавала без кіраўніцтва, таму ніякіх сьлядоў ад яе работы не засталося—ні пісьмовых, ні вусных дакладаў «лёгкая кавалерыя» не прадставіла.

Падрыхтоўка да самых перавыбараў таксама прайшла дрэнна. Былі выбраны камісіі для выпрацоўкі наказу. Цэхавыя камісіі працавалі больш-менш добра, але агульна-фабрычная камісія, на чале якое, між іншым, стаяў член партыі Пятроў, нічога не рабіла. Таксама слабую работу правяла і выбарчая камісія.

У выніку на выбарчых сходах з агульнай колькасьці 525 рабочых прысутнічала 394. Гэта значыць, амаль 25 проц. рабочых у перавыбарах фабкому не прынялі ўдзелу. У параўнаньні з перавыбарамі на фабрыцы «Чырвоная Зорка» (Чашнікі, Віцебская акруга), дзе ў праверцы работы фабкому прыняла ўдзел трэць рабочых, а на выбарчым сходзе з 511 чал. адсутнічалі толькі 4 чал., перавыбары на «Спартаку» прайшлі, такім чынам, зусім дрэнна.

Перавыбары на «Спартаку» не мабілізавалі ўвагі рабочых на выкананьне прамфінпляну. Ужо пасьля перавыбараў мы маем на фабрыцы факт шкодніцтва. Сушыльшчык першай папяровай машыны рабіў шмат браку і ўтойваў яго (замест таго, каб паперу здаваць на каландры для глазіроўкі, ён паперу перадаваў проста на склад).

І хоць фабрыка «Спартак» за першыя пяць месяцаў бягучага гаспадарчага году выканала вытворчую праграму на 101,3 проц., а ва 15 дзён сакавіка нават на 110,9 проц. месячнай вытворчай праграмы, але па фабрыцы ёсьць яшчэ шмат вытворчых недахопаў, на змаганьні з якімі ў часе перавыбараў фабкому ня была завострана ўвага рабочых. Прымаючы таксама пад увагу необходнасьць павялічыць выраб паперы (для фабрыкі «Спартак» на 1.000 тон), трэба было ў часе перавыбараў больш рашуча ўдарыць па вытворчых недахопах. Гэтага ня было зроблена.

Асабліва слабы ўдзел у перавыбарах прыняло бюро парткалектыву, якое абмежавалася зацьвярджэньнем пляну перавыбараў і дырэктывай пахавым партячэйкам, але ніякай практычнай дапамогі не аказала. Яшчэ больш слабы ўдзел прыняла камсамольская ячэйка, вынікам чаго было вельмі нізкае наведваньне сходаў камсамольцамі — ня больш 40 проц.

Вінавата і Магілеўскае акрпрафбюро, якое, ня гледзячы на пастанову ЦСПСВ дапамагчы «Спартаку» прафработнікамі, не паслала ні аднаго чалавека.

Мы лічым, што ў часе напружанага змаганьня за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, у часе перабудовы ўсёй сыстэмы прафработы нельга дапусьціць такога тэмпу ў перавыбарах фабкомаў. ЦП саюзу рабочых папяровай прамысловасьці павінна гэтыя перавыбары скасаваць і правесьці на фабрыцы дадатковую растлумачальную работу. П.

ПАД ПАГРОЗАЮ ЗРЫВУ

На фабрыцы „Гэрой Працы" праверка работы фабкому адтэрмінавана на 10 дзён

Фабрычныя арганізацыі перавыбарамі ня цікавяцца

Праверка работы фабкому ф-кі «Гэрой Працы» брыгадамі добраахвотнікаў павінна была пачацца 20 сакавіка. Поўная непадрыхтаванасьць прымусіла адтэрмінаваць пачатак праверкі да 1 красавіка. Але і цяпер няма яшчэ ўпэўненасьці ў тым, што перавыбары фабкому фабрыкі «Гэрой Працы» адбудуцца згодна існуючых дырэктыў.

Адсутнасьць растлумачальнай работы прывяла да таго, што ў цэхах добра не зразумелі ўсяго палітычнага значэньня перавыбараў. Ня гледзячы на шматлікія просьбы членаў цэхавых прафкамітэтаў, рабочыя адмаўляюцца запісвацца ў брыгады для праверкі работы фабкому.

Прымацаваньня да фабрыкі прафработнікі, за выключэньнем работніка ЦП саюзу — выдуманца тав. Станкевіча, амаль не наведвалі прадпрыемства. Прадстаўнік акрпрафбюро тав. Шапіра наяжджае на фабрыку ў якасьці «гастралёра». Прымацаваны член прэзыдыуму акрпрафбюро тав. Абразовіч на прадпрыемства не зьяўляецца. Рабочая брыгада фабрыкі «Дняпро» (Рэчыца) прыехала на фабрыку толькі гэтымі днямі. Гэта спрыяла таму, што плян падрыхтоўкі ня быў выкананы.

Старшыня ЦП саюзу прымушан быў выехаць на фабрыку. І толькі з яго прыездам на фабрыцы некалькі заварушыліся, але мала.

Фабком падрыхтоўкай да перавыбараў цікавіцца вельмі мала. Ён заняты бягучай работай. Бюро райкому партыі зацьвердзіла плян перавыбараў, дало дырэктывы цэхавым партячэйкам, але, паколькі адначасова разгарнула падрыхтоўку да перавыбараў цэхавых партячэек, не разьмежаваўшы тэрміны перавыбараў тых і іншых, пастолькі цэхпартячэйкі не зварачаюць належнае ўвагі на падрыхтоўку да перавыбараў фабкому.

Між тым, на перавыбары фабкому на фабрыцы «Гэрой Працы» трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Трэба ўлічыць, што «Гэрой Працы», ня гледзячы на посьпехі ў выкананьні прамфінпляну за першую палову сакавіка (выкананьне вытворчай праграмы на 107 проц.), за 5 месяцаў гаспадарчага году выканаў вытворчую праграму толькі на 97,3 проц. у колькасным азначэньні і на 96,6 проц. у цэннасным азначэньні. Між тым, перад нашай папяровай прамысловасьцю стаіць зараз задача павялічыць сваю вытворчую праграму ў сувязі з папяровым крызісам. Для фабрыкі «Гэрой Працы» вызначаецца дадатковая пічса ў 1.600—2.000 тон паперы. Гэтыя вытворчыя задачы павінны заняць цэнтр увагі ўсёй падрыхтоўчай і перавыбарнай кампаніі фабкому і наказу новаму фабкому. У часе перавыбараў трэба мабілізаваць усю энэргію ўсяго паўтаратысячнага калектыву рабочых на перавыкананьне вытворчых пляноў, на перамогу вытворчых недахопаў, якіх яшчэ вельмі шмат у рабоце цэхаў.

Напрыклад, на фабрыцы зараз ляжыць 800 тон неапрацаванай паперы коштам каля ½ мільёна рублёў. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што ляжаць, так званыя, культурныя гатункі паперы, г. зн. паперы, на якой друкуюцца кнігі, сшыткі і г. д. А, як вядома, мільёны кніжак і брашур ня выпушчаны, з прычыны адсутнасьці патрэбнай паперы.

Гэты абураючы факт — значны залеж паперы — здарыўся, а прычыны невыстарчальнай увязкі ў рабоце цэхаў, адсутнасьці належнай распарадчасьці і гібкасьці ў кіраўніцтве фабрыкай і рабоце цэхавай адміністрацыі і незацікаўленасьці гэта ісправай фабкому.

27-га сакавіка рабокры фабрыкі зрабілі начны «налёт» на цэхі. Вынікі «налёту» таксама прымушаюць біць трывогу. Выкрыт рад фактаў злачынных адносін да вытворчасьці. Напрыклад, каландроўшчыкі, якія павінны былі глазіраваць паперу, былі пасланы адвозіць брака календы стаялі. На фоне вялікіх залежаў неапрацаванай паперы, гэты факт пахне чымсьці большым, чым проста нядбайнымі адносінамі да вытворчасьці.

Алін з каландроўшчыкаў паскардзіўся, што ўжо цэлы тыдзень, як на шыпнік у каландры грэецца, нелі працаваць, а між тым, ён не рамантуецца. У ваганэтках знайшлі бяты цьвікі, якія псавалі рулёны паперы і значна павялічвалі брак.

Два рабочыя каля варштатаў спалі. Два былі п'яныя. У той час у цэхах было цэхавай адміністрацыі.

Заўважана недахват пары, між тым катлы доўгі час ня чышчаны і та працуюць з меншай прадукцыйнасьцю. Вось гэтымі недахопамі і павінен б фабком зацікавіцца, паставіць іх абгаварэньне рабочых. Між тым, фабк нават у часе падрыхтоўкі да перавыбараў ня лічыць патрэбным заваст... гэтае пытаньне перад рабочым кал... тывам.

Трэба памятаць, што вызьв... якасьць падрыхтоўкі да перавыбараў будзем толькі з пункту погл... зьнішчэньня ўсіх вытворчых неда... паў, з пункту погляду выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Д—...

Агляд грамадзкага харчаваньня

Неадкладна арганізаваць харчовыя пункты на мясцох палявых работ

Белкалгасцэнтр і Белкаапсаюз не аддаюць патрэбнае ўвагі пытаньню абслугоўваньня веснавой сяўбы

Ня даць заглухнуць жывой справе

З матар'ялаў, якія друкуюцца сёньня, відаць, што агляд грамадзкага харчаваньня ўжо ахапіў значную колькасьць гарадоў і мястэчак БССР. Адзначаем характэрную рысу. Усе матар'ялы з розных месц трактуюць аб адных і тых-жа нездаровых момантах. Адягназ адзін — перагрузка сталовых і пэрсаналу, чэргі, бруд і дрэнная якасьць харчаваньня.

Тым-часцей будзе каапэратарам, гаспадарнікам і грамадзкасьці гэтыя спабы вучаткі і грамадзкім харчаваньні выправіць.

Калі ў гарадох і мястэчках справа ідзе аб пашырэньні існуючай сеткі і палепшэньні грамадзкага харчаваньня, дык у вясковым сэктары гэтая справа толькі пачынае арганізоўвацца.

У раней зьмешчаных артыкулах мы вызначалі — ПРАВЕСЬЦІ АГЛЯД ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ Ў ВЁСЦЫ ПАД КУТОМ ПОГЛЯДУ ПРЫСТАСАВАНЬНЯ ЯГО ДА ВЕСНАВЫХ ПАЛЯВЫХ РАБОТ.

АРГАНІЗАЦЫЯ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ Ў ЧАСЕ ВЫХАДУ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ ЁСЬЦЬ ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА РАБОТЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ.

Усякая бязьдзейнасьць у гэтай галіне недапушчальна.

Але дагэтуль мы ня ведаем, ДЗЕ І НА ЯКІХ ВУЧАСТКАХ ВЁСКІ БУДЗЕ АРГАНІЗАВАНА ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ, яшчэ ня высьветлена пытаньне аб сродках і кадрах. Усё гэта ставіць пад вялікае сумненьне выкананьне плянаў арганізацыі 200 сталовых у калгасах і 400 палявых кухань.

НЕЛЬГА ДАПУСЬЦІЦЬ, КАБ ЖЫВАЯ, ПАТРЭБНАЯ СПРАВА ЗАГЛУХЛА У БЮРАКРАТЫЧНЫХ ПАРТФЭЛЯХ І КАНЦЫЛЯРЫЯХ Белкалгасцэнтру, Белсельтрэсту і Белкаапсаюзу.

Пакуль будуць арганізоўвацца сталоўкі стацыянарнага тыпу, ПАЛЯВЫЯ АЧАГІ-КУХНІ ПАВІННЫ БЫЦЬ КІНУТЫ НА ВУЧАСТКІ ПАЛЯВЫХ РАБОТ І Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ Ў РАЁНЫ СУЦЭЛЬНАЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Пытаньне аб сродках і кадрах неабходна фарсаваць. Пакуль будуць ісьці гутаркі аб арганізацыі фабзавучу, ПРАФСАЮЗЫ І ГАСПАДАРЧЫЯ ОРГАНЫ ПАВІННЫ ЗНАЙСЬЦІ ГЭТЫЯ КАДРЫ НА МЕСЦЫ, ПРАПУСЬЦІЦЬ ІХ ПРЭЗ КАРОТКАТЭРМІНОВЫЯ КУРСЫ І КІНУЦЬ НА ВУЧАСТКІ ПАЛЯВЫХ РАБОТ.

МЫ БЕМ ТРЫВОГУ. МЫ НАСТОЙЛІВА ПАТРАБУЕМ АД БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ, БЕЛКААПСАЮЗУ, БЕЛСЕЛЬТРЭСТУ І ІНШЫХ ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ ГЭТУ РАБОТУ. Вызначаныя пляны павінны быць дакладна прагледжаны і ў першую чаргу вызначаны на абгаварэньне грамадзкасьці.

Да ўвагі рабочых брыгад

Работнікі сталовак імкнуцца адшукаць рознага роду «аб'ектыўныя» прычыны, каб слумачыць імі недахопы грамадзкага харчаваньня. Але галоўная прычына недахопаў — нялбныя адносіны адміністрацыі сталовак да сваіх абавязкаў. Гуркоў не загатаўляюць своечасова, калі трэба падаваць абед, тады толькі пачынаюць шукаць гуркоў або іншых необходных прадуктаў.

Выдаюць мяса, напрыклад, на 800 абедаў, сьмятана адпускаюць толькі на 200 абедаў, а адпускаюць абедаў значна большую колькасьць. У выніку абеды нясмачныя і неспажыўныя.

У сталоўках брудна, сталы своечасова не выціраюцца таму, што вельмі загружаны. Ня гледзячы на тое, што павелюць, сталоў не абрываюцца.

Кнігі скаргаў не запоўнены таму, што спажыўцу ўжо надакучыла пісаць, бо адказаў на скаргі не даюць.

Белпрабсэкцыя на сталоўкі зварачае вельмі мала ўвагі. Кіраўніцтва Белпрабсэкцыі заключаецца ў тым, што раз у год прысылаецца доктар і яму даюць аналіз абеду.

Рабочым брыгадам усё гэта трэба прыняць пад увагу. Ім павінны дапамагчы усе працаўнікі сталовак, бо трэба-ж, нарэшце, адшукаць вінаватых і належным чынам пакараць іх. Загалучыць сталовак будуць апрацоўцы недахватам прадуктаў і «аб'ектыўнымі» ўмовамі, але, калі-б гэтыя загалчыкі былі на месцы, то шмат чаго можна было-б палепшыць і ў цяперашніх умовах і пры недахваце прадуктаў.

Работніца 9-й сталоўкі СЛІНА.

Нікуды нягоднае абслугоўваньне

Зусім не здавальняе запатрабаваньняў рабочых мас сталоўка МЦРК № 2.

Перш за ўсё аб яе санітарным станоўішчы. На падлозе шмат бруду, сталы змываюцца адзін раз у дзень і заўсёды яны пакрыты пластом бруду. Пляваньніц мала, плююць усюды.

Часта ў абедзе можна знайсьці кавалак газэты або анучы. Наведвальнікі курыць, і калі папрыходзіць шмат народу, дык у сталоўцы нельга ўседзець, ад гарачыні і дыму.

Афіцыянты пачынаюць сварыцца і на гэта марнуюць шмат часу, а ў выніку ствараюцца вялікі «хвасты».

Часта абеды падаюцца халодныя, недасоленыя, або перасоленыя. Замест шклянкі гарбаты падаюць паўшклянкі, але затое продаж піва ў гэтай сталоўцы разгорнут вельмі шырока. А бывае, што пад выглядам піва п'юць гарэлку. Працаўнікі сталоўкі з наведвальнікам ня хочуць гаварыць. Каб даведацца, што сёньня на абед, трэба запытацца 5 раз. Абеды ў сталоўцы № 2 чамусьці даражэйшыя, чым у іншых сталоўках (шклянка гарбаты каштуе 8 кап., а ў іншых—5-6 кап., порцыя парасяці—50 кап., а ў іншых—48). Умова на сацыялістычнае спаборніцтва з іншымі сталоўкамі заключана, але як яна выконваецца, ніхто ня ведае. Нават сам загалчык на запытаньне аб гэтым адказвае: «я нічога ня ведаю».

Шумілы.

Чым кормяць пасажыраў?

Хто паабедае ў сталоўцы пры ст. Ворша, той потым будзе хварэць цэлы тыдзень. На «першае» падаюць борщ з грыбамі, чаго толькі ў гэтым баршчы няма: і трохі капусты, буракоў і шмат чаго, усяго і не пазнаеш. На «другое» даюць кашэту, але яна ня з мяса, а з хлеба і яшчэ з нейкай жудасьцю, што есьці боязна. Ад яе вельмі сьмярдзіць. І такі абед каштуе 65 кап. Ім кормяць ня толькі пасажырыў, а і рабочых Аршанскага чыгуначнага вузла. Абслугоўваючы пэрсанал да сваіх абавязкаў адносіцца дрэнна. Гэтага «абеду» прыходзіцца доўга чакаць, нават бываюць выпадкі, што пасажыры адстаюць цягніка. Цікава, што скажуць аб аршанскія каапэратары?

Куды трэба зірнуць саюзу нархарч

Памяшканьне сталоўкі № 1 МЦРК пядаўна рамантавалася. Але рамонт быў вельмі няўдалы, прышлося ўсё пераробляць напава. Зробленую пліту зноў пераробялі. Тое-ж самае і з вэнтылятарам. Бак з вадой падвесілі над галовамі рабочых і ён ледзь-ледзь не сарваўся разам са столлю. Хоць нейкі рамонт зрабілі, але стан сталоўкі ад гэтага ніколькі не палепшыўся. Тыя-ж самыя «хвасты», тое-жа

Палажэньне аб вытворчых нарадах у калгасах БССР

Зацьверджана праўленьнем Белкалгасцэнтру 26 сакавіка 1930 г.

I. Задачы вытворчых нарад

1. Задачай вытворчых нарад калгасаў зьяўляецца ўцягненьне шырокіх мас калгаснікаў і калгасніц да актыўнага ўдзелу ў пабудове калектыўнай гаспадаркі, на падставе ацэнкаваньня, распрацоўкі і абмеркаваньня мерапрыемстваў па рацыяналізацыі ўсёй гаспадаркі і паасобных яе галін, спэцыялізацыі гаспадаркі і павышэньня таварнасьці і прадукцыйнасьці працы, выхаваньня калгаснікаў у духу сьвядомых адносін да калектыўнай вытворчасьці, прылад, машын і матар'ялаў гаспадаркі, эканамічнага выдаткаваньня сродкаў, зьніжэньня сабекошту, скарыстаньня ініцыятывы і вынаходзтва калгаснікаў, разгортваньня ў калгасе сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

II. Арганізацыйная пабудова і склад вытворчых нарад

2. Вытворчыя нарады арганізуюцца ва ўсіх калгасах.

3. У калгасах, дзе ў паасобных галінах гаспадаркі (зямляробства, жывёлагадоўля, гароднiцтва, машына-конныя станцыі, дагаможныя прадпрыемствы і г. д.) занята больш, чым 10 асоб у кожнай, вытворчыя нарады арганізуюцца асобна ў кожнай галіне гаспадаркі.

4. Калі калгасы разьбіты на некалькі аддзяленьняў (эканоміі), то у кожным аддзяленьні (эканоміі) арганізуюцца асобныя вытворчыя нарады.

5. У буйных калгасах, дзе вытворчыя нарады складзены па асобных галінах гаспадаркі, а таксама па аддзяленьнях (эканоміях), склікаюцца агульна-калгасныя вытворчыя канфэрэнцыі.

6) Вытворчыя нарады пры калгасах складаюцца з:

а) актыўных калгаснікаў і калгасніц, а таксама з усіх жадаючых членаў калгасу;

б) спэцыялістых, тэхнічнага пэрсаналу калгасу;

в) прадстаўнікоў адг групы беднаты;

г) прадстаўнікоў ад праўленьня калгасу і кіраўнікоў паасобных галін;

д) асоб на спэцыяльным запрашэньні;

7. Акрамя непасрэднага калгаснага актыву да ўдзелу ў вытворчых нарадах павінны запрашацца прадстаўнікі вытворчых нарад: сельсавету блізка прылеглых саўгасаў, фабрык, заводаў, саматужна-прамысловых арцеляй.

8. Агульна-калгасныя вытворчыя канфэрэнцыі буйных калгасаў складаюцца з:

а) членаў бюро вытворчых нарад, аддзяленьняў эканоміі і паасобных галін гаспадаркі;

б) з прадстаўнікоў праўленьня калгасу і прадстаўнікоў паасобных галін гаспадаркі;

в) спэцыялістых і тэхнічнага пэрсаналу калгасу;

г) актыўнейшых калгаснікаў і ўсіх жадаючых членаў калгасаў;

д) з прадстаўнікоў груп беднаты;

е) асоб па спэцыяльным запрашэньні.

III. Зьмест працы вытворчых нарад

9. Зьместам працы вытворчых нарад калгасаў павінна зьяўляцца абмеркаваньне і тэхнічная прапрацоўка пытаньняў, выходзячы з задач, паказаных у § 1 гэтага палажэньня.

Арыентовачнае кола пытаньняў, якімі павінны займацца вытворчыя нарады, зьяўляецца наступным:

а) прапрацоўка арганізацыйна-вытворчых плянаў калгасу (як у цэлым, так і ў паасобных частках);

б) мерапрыемствы па эканомным выдаткаваньні грашовых сродкаў і матар'ялаў;

в) арганізацыя працы ў калгасе і паасобных галінах сельскай гаспадаркі і прамысловасьці;

г) рацыянальнае і поўнае скарыстаньне рабочай сілы і вылучэньне на адыходныя промыслы;

д) павышэньне прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту;

е) мерапрыемствы, якія сьпрыяюць і забясьпечваюць узьнікьце ўраджайнасьці і таварнасьці.

ж) спэцыялізацыя калгасу і разьвіцьцё новых галін;

з) пытаньне рацыяналізацыі і мэханізацыі гаспадаркі;

і) пляны новага будаўніцтва і рамонтных работ;

к) вынаходзтва калгаснікаў і ўдасканаленьне паасобных працэсаў і відаў работ;

л) становішча і скарыстаньне цягавай сілы і іншай абагуленай маемасьці;

м) пытаньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва;

н) пытаньні арганізацыі кіраўніцтва, кантролю і ўліку вытворчасьці.

10. Вытворчыя нарады павінны зьяўляцца ініцыятарамі і арганізатарамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарных мэтаваў працы (ударныя брыгады, ударныя галіны, ударныя калгасы), уцягваючы ва ўдарніцтва ўсю масу калгаснікаў і калгасніц на чале з батрацка-бядняцкім і партыйна-камсамольскім актывам.

11. Вытворчыя нарады павінны ўважліва вывучаць і заахвочваць ініцыятыву калгаснікаў у справе падняцьця прадукцыйнасьці працы, стварэньня адпаведнага фонду праўленьня для прэміяваньня калгаснікаў за каштоўныя прапановы, вынаходзтва і ўдасканаленьне вытворчасьці.

12. Вытворчыя нарады абмяркоўваюць пытаньні накіраваньня пераладзкі калгаснікаў-ударнікаў на розныя курсы калгасаспэцаў і навучальныя ўстановы (рабфакі, ВНУ).

13. У мэтах абмену практыкай працы, вытворчыя нарады арганізуюць у вольныя ад працы часы экскурсіі ў суседнія саўгасы, калгасы, прадпрыемствы, наладжваючы з імі для гэтага сьцісłую сувязь.

14. Вытворчыя нарады сумесна і пад кіраўніцтвам праўленьня калгасу (праз вытворчую камісію) арганізуюць спэцыяльныя вытворчыя гурткі, школы і курсы па павышэньні вытворчасьці, кваліфікацыі і набыцьця тэхнічных ведаў калгаснікамі.

15. Падлік праробленай працы вытворчых нарад вядзецца вытворчымі камісіямі.

IV. Тэрмін скліканьня вытворчых нарад

16. Вытворчыя нарады склікаюцца праз вытворчую камісію ў вызначаныя плянам і ўзгодненыя з праўленьнем калгасу тэрміны.

17. Вытворчыя нарады па асобных галінах гаспадаркі і па аддзяленьнях калгасу зьбіраюцца ня менш разу ў месяц.

18. Агульна-калгасныя вытворчыя канфэрэнцыі ў буйных калгасах зьбіраюцца ў вольны ад палявых работ час, але ня менш разу ў 2 месяцы.

V. Кіраўніцтва вытворчымі нарадамі

19. Агульнае кіраваньне вытворчымі нарадамі належыць праўленьню калгасу, якое практычна ажыцьцяўляецца праз вытворчую камісію, абіраную на вытворчай нарадзе ў складзе ад 3 да 7 асоб і зацьверджаную агульным сходам, або сходам упоўнаважаных, ці па іх даручэньні праўленьнем калгасу. Старшынёю вытворчай камісіі выбіраецца член праўленьня калгасу.

20. Вытворчая камісія выконвае абавязкі бюро вытворчай нарады, падрыхтоўвае парадак дня вытворчае нарады, які зацьверджаецца праўленьнем калгасу, падрыхтоўвае прапановы і матар'ялы па пытаньнях, якія ўносяцца на разгляд вытворчых нарад, прапрацоўвае пастановы вытворчых нарад і сочыць за іх выкананьнем.

21. Вытворчыя нарады ня маюць права непасрэдна ўмешвацца ў адміністрацыйна-гаспадарчую дзейнасьць калгасу, а іх пастановы ўносяцца вытворчымі камісіямі на разгляд праўленьня калгасу, якое прымае канчатковыя пастановы.

Калі праўленьне калгасу ня згодна з утрунтаванымі прапановамі вытворчае нарады, то яны ўносяцца на разгляд агульнага сходу, ці сходу ўпоўнаважаных калгасу.

22. Праўленьне калгасу і вытворчая камісія павінны прымаць захады да ўцягненьня ў працы ў вытворчых нарадах, да падрыхтоўкі прапаноў і правядзеньня іх у жыцьцё ўсіх актыўных калгаснікаў, батрацка-бядняцкіх груп, партыйна-камсамольскага актыву і адміністрацыйна-тэхнічных працаўнікоў.

23. Плян працы вытворчых нарад распрацоўваецца вытворчай камісіяй, уносіцца на абмеркаваньне вытворчых нарад і канчаткова зацьверджаецца праўленьнем калгасу.

24. Пры складаньні пляну, а таксама і ва ўсёй працы вытворчых нарад павінна прадугледжвацца ўстанаўленьне самай сьцісłай сувязі і абмену практыкай з вытворчымі нарадамі сельсаветаў, блізка прылеглых саўгасаў, фабрык, ці заводу, саматужна-прамысловымі арцелямі і асьвятленьне выпікаў і прыкладаў работы ў друку.

УВАГА!!!

Як рабкорам і рэдкалегіям насьценгазэт удзельнічаць у праверцы выкананьня дагавароў па сацспаборніцтве,

якім чынам можна паступіць у Дзяржаўны Інстытут Журналістыкі,

якія адносіны мэтуць рабкоры і рэдкалегіі да падрыхтоўкі кадраў для цэнтральных і акруговых газэт Беларусі — гэтыя пытаньні будуць абгаварвацца **на АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІМ СХОДЗЕ** рабкораў і рэдкалегій насьценгазэт, які адбудзецца сёньня, а 7 гадз. веч., у памяшканьні рэдакцыі газэты **„ЗЬВЯЗДА“.**

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

У мэтах апублікаваньня ў найбольш правераным і ня скажаным выглядзе твораў і паасобных артыкулаў Леніна, а таксама ўсякай літаратуры, дзе зьмяшчаюцца ленінскія матар'ялы, лічыць неабходным:

1) Аўтэнтычным ленінскім тэкстам на беларускай мове лічыць тэкст «Збору твораў», з якім абавязкова павінны ў далейшым зьвярацца ўсе ленінскія тэксты розных выданьняў (кніг, артыкулаў, зборнікаў і г. д.).

2) Да таго часу, пакуль усе ленінскія творы выйдуць, апублікаваньне на беларускай мове ленінскіх тэкстаў (зборнікаў, хрэстаматый і паасобных твораў Леніна, а таксама літаратуры па ленінізму) усімі выдавецтвамі павінна рабіцца толькі пасьля ўзгадненьня і зацьверджаньня іх Інстытутам Гісторыі Партыі і рэв. руху пры ЦК КП(б)Б.

Бібліяграфія

Гімны хутарской гаспадарцы

Падручнік «Пионеры новой деревни», выданы «Молодой Гвардией», які рэкамэндуецца Наркамасьветы школам сялянскае моладзі і сельска-гаспадарчым гуртком, зьяўляецца зусім шкодным кніжкай.

У аддзеле аб выбары зямлякарыстаньня, на старонцы 499 аўтар Кісьлянскі з энтузіязмам агітуе за гаспадарчую выгоднасьць хутарской гаспадаркі: «Главная выгода хуторского землепользования заключается в том, что на хуторе переделовому хозяину (!) никто не может помешать улучшению хозяйства».

Яшчэ з большым энтузіязмам аўтар рознымі прыкладамі агітуе за сталыпіна-прышчэпаўскую форму зямлякарыстаньня. На старонцы 501 ён піша: «В самом деле, машина в несколько раз сокращает время и труд, чем скоро и окупается, затем начинает давать чистый доход. Также сокращает расход времени и труда переход к отрубному, хуторскому и поселковому землепользованию».

Далей аўтар піша: «Сходство между машинной работой и хуторским, а также поселковым землепользованием идет и дальше. И машины и хутор требуют для их введения затрат, но есть и разница. Машина от работы изнашивается, требует дальнейших затрат на ремонт и погашение. Хуторское-же и поселковое землепользование требует затрат только один раз: на землемера и проч. Затем уже хутор, как и некрупный поселок дает чистую выгоду».

У аддзеле аб задачах сельска-гаспадарчай каапэрацыі аўтар зводзіць усю працу с.-г. каапэрацыі да збыту прадуктаў, забесьпячэньня вясковага насельніцтва таварамі і толькі. «Крестьянин идет в сельско-хозяйственную кооперацию,—піша аўтар,—потому чтобы получить выгоду», каб «дороже продать, а дешевле купить».

Кожная старонка гэтае кнігі прасякнута імкненьнем, як мага лепш разграбляваць выгоднасьць індывідуальнае гаспадаркі. На працягу ўсіх 520 старонак падручніка ні слова няма аб калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Падручнікам карыстаюцца і зараз. Яго трэба зьняць з ужываньня.

С. Зысман.

31 сакавіка, а 18 гадзіне ўвечары

КАЗНАЧЕЙСКА ЗБОР

старога і новага атрадаў Асаавіяхіму

Збор адбудзецца ў памяшканьні 2-ой школы (Левінская, 21, суседзь пошты).

Яўка абавязкова.

Праўленьне атраду.

Група „былых“ на чале саўгасу Старыца-Лапухі

Безгаспадарчасьць, сувязь з прыватнікам, заціск самакрытыкі

У пачатку 1929 году група рабочых саўгасу Лапухі-Старыца падала ў Гроскі райком КП(б)Б заяву аб заціску самакрытыкі і аб безгаспадарчасьці ў саўгасе.

Расьсьледваньнем гэтай заявы занялася спэцыяльная камісія Белсельтрэсту і саюзу с.-г. рабочых, якая ў жніўні мінулага году праверыла факты, адзначаныя рабочымі. Факты поўнасьцю пацьвердзіліся.

Выявілася, што саўгасам кіраваў былы афіцэр **Купрэвіч**, што бухгальтар **Казуліч** — былы земскі начальнік, весаўшчык і заг. гаспадаркай—валасны пісар і працаўнік Белы—растратчык. Адным словам, саўгасам Старыца-Лапухі кіравала група былых людзей, якая давяла саўгас да развалу.

У саўгасе быў поўны заціск самакрытыкі, панскія адносіны да рабочых і самае грубае свавольства. Рабочыя не адважваліся адкрыта выступаць супроць кіраўнікоў-шкоднікаў, бо ім пагражалі за выступленьне звальненьнем і высяленьнем з кватэр.

Заціск самакрытыкі дапамагаў захоўваньню безгаспадарчасьці і пераліваньню дзяржаўных сродкаў у кішэні прыватнікаў.

Даволі паказаць на такія факты, што ў 1928 годзе было ня сабрана з поля каля 6 гэкт. насеннага лубіну, што нехапала 41 з паловай тон лугавога сена, што рамонтам машын ніхто не займаўся і яны за зіму сапсаваліся. Кіраўнік Купрэвіч падтрымліваў сувязь з прыватнікамі, даваў ім карысныя падрады на тысяч рублёў, а бедняком адмаўляў у рабоце.

Зарплата выдавалася са спазьненьнем, якое даходзіла да 3-х месяцаў. Рабочыя жылі і жывуць у хатах без падлог.

Вылікі з заработнай платы за 2-ю пазыку індустрыялізацыі ня ўносіліся ў банк, а потым былі зьвернуты рабочым.

Ня гледзячы на тое, што акт камісіі быў складзены яшчэ летам мінулага году, у саўгасе **нічога не зьмянілася і па гэты час. Нічога ня зроблена, каб ажыцьцявіць прапановы акту, каб зьмяніць кіраўніцтва, каб абараніць інтарэсы рабочых, каб разгарнуць самакрытыку.**

Вінаваты ў гэтым бюракраты з Белсельтрэсту, цэнтральнага праўленьня саюзу і Гроскай пракуратуры, якія нічога не зрабілі, каб аздаравіць саўгас, каб выканаць прапановы рабочых.

Толькі зараз прэзыдым Беларускага камітэту саюзу с.-г. рабочых абгаварыў гэту справу, заслухаў даклад Купрэвіча і старшыні рабачкому аб падрыхтоўцы саўгасу да пасеўкампаніі і аб ходзе сацспаборніцтва.

Прэзыдым прызнаў агульную падрыхтоўку саўгасу да пасеўкампаніі зусім незадавальняючай.

Рабочы камітэт ня выканаў дырэктыў аб мабілізацыі рабочых да актыўнага ўдзелу ў выкананьні прамфінпляну саўгасу. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва праводзілася фармальна на паперы.

Рабачком не забясьпечыў разгортваньня самакрытыкі ў саўгасе. Факты гаспадарчасьці ня ажыты.

Прэзыдыум Белкамітэту запрапанаваў Белсельтрэсту безадкладна зьняць з работы кіраўніка саўгасу Купрэвіча. Зьняты з работы старшыня рабачкому тав. Шэйка.

Прэзыдыум пастанавіў прасіць пракуратуру расьследаваць гэту справу і **наватых у безгаспадарчасьці прыцягнуць да судовай адказнасьці.**

У саўгас для наладжваньня прафработы камандыраваны член прэзыдыуму тав. Аскерка. Прэзыдыум адначасова пастанавіў правесьці расьсьледваньне чаму ня выкананы акт рэвізіі саўгасу.

СВС.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

„Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена» сумесна з падзівам 2 скліканьць нараду ўсіх камсамольцаў - пераменьнікаў па-за вайсавікоў і дапрызыўнікаў 1-га красавіка, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому Камсамолу па пытаньні «Аб задачах міжзбораваў работы». — Дакладчык тав. Арлоў. Яўка абавязкова.

НК РСІ і ЦП саюзу саўгандальслужачых 1-га красавіка ў 19 гадз. скліканьць у **клюбе саўгандальслужачых** шырокую нараду прафактыву саюзу саўгандальслужачых з наступным парадкам дня.

Даклад прадстаўнікоў маскоўскага інстытуту тэхнікі і кіраўніцтва пры НК РСІ СССР аб асноўных прынцыпах арганізацыі дапаможна - абслугоўваючых функцый і мэханізацыі у Ц. Доме Ўраду БССР.

Яўка членаў эканамкамісіі, рацыяналізатараў, брыгад па агляду рацыяналізатарскай работы абавязкова. Зьвяр. усе члены МК, члены саюзу.

«Рэдакцыя газэты **«Чырвоная Зьмена»** сумесна з **Домам Чырвонай арміі** наладжваць 3-га красавіка, а 8-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса **вечар сустрэчы чырвонаармейцаў з музычна - кампазытарскай і пісьменьніцкай грамадзкасьцю на тэму: «Стварэньне новай чырвонаармейскай песьні».**

СЁНЬНЯ

Унівэрсытэцкі гарадок (анат. корпус, III-ці паверх). У 19 гадз. — лекцыя дац. **Чарвакова на тэму:** «Мошчы ў сьвятле навуковых даных» з дэманстрацыяй машчэй.

Клюб навуковых працаўнікоў. Пасядж. Бел т-ва ваяўнічых матар'яліст.-дыялектыкаў — Спрэчкі па дакладу праф. **Бурстына.** Пач. у 20 гадз.

Дом Чырвонай армії. Камсамольская палітасьвет. цэх'ачэйка Працасьветы праводзіць у 19 гадз. спаборніцтва на стральбе. Яўка камс. абавязкова.

АД КАСТРЫЧНІЦКАГА РК КП(б)Б

Кастрычн. РК КП(б)Б даводзіць да ведама дэлегатаў, прамапаваных да Чырвонага Крыжу, што 31-га сакавіка у 18 гадз. у памяшканьні Чырвонага Крыжу (вул. К. Маркса, 3) адбудзецца нарада, на якую павінны зьявіцца наступныя дэлегаты: Пачыкайла, Гінзбург Шыманская, Ігнатовіч, Эстаркіна, Рубенчык, Позіна, Беравольскага, Фальман, Тышкевіч, Турамшова, Равік, Урублеўская, Рабрыева, Дорапэнка (АБВШ), Дорапэнка (дом гр. дзіцці), Калечыц і Рубінштэйн.

ЗАЎТРА

Пасяджэньне асьпіранцкага бюро ў габінэце прарактара (чэнкорпус) у 17 гадз. Выклік — **Пракапчук і Ляганчанка.**

Дом Асьветы. У 19 гадз. агульна-гарадзкі сход мепскіх асьветнікаў. Парадак дня. інфармацыя інспектара РСІ тав. **Мікалаева** аб становішчы школ сацвыху і працы інспэктуры.

Клюб Мэдсанпрацы. Сход членаў навуковай асацыяцыі пры саюзе Мэдсанпрацы з наступным парадкам дня: 1) дэманстрацыя хворых, 2) дац. Моносон аб перыхіноэе, 3) даклад д-ра Шапіра аб уплыве біолёг. і сап. фактараў на страўнікавую сэкрэцыю. Запрашаюцца рабочыя харчовай прамысловасьці.

Дом Камасьветы. Ад 19—21 гадз. — індывід. кансульт. **т. Шапавалава** па гісторыі УсеКП(б) і КП(б)Б (пакой 21).

— У 19 гадз. індывід. кансульт. па літар. і літаратурнай палітыцы (пакой 21).

Т. т. ПАЙШЧЫКІ!

Рабочая брыгада, выпучаная ФЗК 1-й друкарні ў дапамогу праверкому па чыстцы саўапарату 3-га групаму МЦРК, які абслугоўвае магазыны № 39 і 2, просіць пайшчыкаў, прымацаных да гэтых магазынаў, давець мо[illegible]ялы як на працаўнікоў магазынаў, так і аб недахопах у рабоце. Матар'ялы [illegible] аб [illegible] дзямурны [illegible] у [illegible] рабочай брыгады ад 19 да [illegible] гадз.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Аб'ядн. пасяджэньне бюро [illegible] РСІ [illegible] адбудзецца 2-га красавіка [illegible] гадз. [illegible] фабрыцы «Кастрычнік» [illegible] ліна). Выклікаюцца рабсн[illegible] [illegible] Шэфэр, Васільлеў [illegible] Кожар Хомфармзавод, Самсанов [illegible] Шаф Мастакова, Лабецкая, Краснас[illegible] Ліўшыц, Падеєш і Бабі[illegible] «Кастрычнік»; Рубе[illegible] [illegible] — ф-ка «[illegible]».

Клюб друкароў. 2-га красавіка [illegible]но-сэансы: «Шаснаццаты» — м[illegible] драма ў 6-ці частках і кіно[illegible]. Пачатак у 19 і 21 гадз. Білеты [illegible] клюбу з 17 гадз.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ

МЕНАЗЕТ

Сёньня, 31 сакавіка а 7 гадз. увеч. у залі клюбу імя Карла Маркса

Інтэрнацыянальны вечар-мітынг

Даклад старшыні ЦВК СССР і БССР т. ЧАРВЯКОВА.

«Задачы і мерапрыемствы партыі і сав. улады па ўцягненьні працоўных яўрэяў і яўр. беднаты ў вытворчую працу ў сувязі з разгортваньнем індустрыялізацыі. будаўніцтва».

Білеты па яч. АЗЕТ па прадпр. і ўстановах.

Менгзет.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Панядзелак, 31 сакавіка. Апошні адкрыты спэктакль

РАЗДОМ Б. Лаўрэнёў. П'еса у 4 дзеях.

Білеты ў касе тэатру і ў рабочай касе. Пачатак а 6 гадз.

ГАТЭЛЬ „САВОЙ“

Кіно „КУЛЬТУРА“

Сёньня, 31 сакавіка прэм'ера

ЮДА

Сцэнары П. БЛЯХІНА.
Рэжысэр Е. ІВАНОЎ-БАРКОЎ.
Аператар Г. ГІБЭР.

У галоўных ролях: К. АВАЛГРА, Э. ЦЭСАРСКАЯ, Е. ІЛЬЛЮШЭНКА, Б. ФЭРДЫНАНДАЎ, В. РАГОЖЫН, В. КАЎРЫГІН.

)—(Пачатак сэансаў:)—(

ДЗЕННЫЯ. 1-ы-а 1 гадз. дня. 2-гі-а 3 гадз. 15 м.

ВЯЧЭРНІЯ: 1-ы-а 7 гадз. 2-гі-а 8 гадз. 30 м. 3-ці-а 10 г. 30 м.

На дзенныя сэансы цэны зьніжаны ад 10 к. да 35 к.

Каса—ад 12 г. дня. Каса—ад 5 гадз

Кіно „СПАРТАК“. 3 панядзелка, 31 сакавіка

мастацкі баявік

ПАВЕК З ЛЕСУ драма ў 7 частках.

Да 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 г. 30 м.

ВЕЧАРОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы прыхтуюць работнікаў для візавых казэнцкіх аддзелаў, спажывецкіх таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй не ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведныя пасьведчаньні.

Плата за курс [illegible] руб. пры паступленьні, а [illegible] месяца. Умовы прыёму [illegible]

Усю карэспанд[illegible] на [illegible] 36, скр. № 44.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“. З панядзелка, 31 сакавіка

—2-гі тыдзень—2-гі—

БЭЦЬЦІ КАМПСОН у амэрыканскім фільме

У ДОКАХ НЬЮ-ЁРКА

ў 8 частках.

Штодзенна 4 сэансы: Пачатак 1-га сэансу а 6 г., 2-га—а 7 г. 30 м., 3-га—а 9 г., 4-га—а 10 г. 50 м.

Каса адкрыта ад 5 гадз.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР“

З панядзелка, 31 сакавіка

мастацкі фільм

АБЛОМАК ІМПЭРЫІ

драма у 6 част. Рэжысэр Ф. ЭРМЛЕР.

У галоўных ролях: Ф. Нікіція, Я. Гудкіна, Л. Сямёнава, В. Салаўцоў.

Штодзенна 2 сэансы. Пачатак 1-га сэансу а 1 г., 2-га а 2 г. 30 м.

Каса адкрыта ад 12 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ ПРАЦУЕ БЕСЬПЕРАПЫННА АД 12 ГАДЗ. ДНЯ.

З панядзелка, 31-га сакавіка

Непераўзыдальны **ДУГЛАС МАК-ЛІН**

У АМЭРЫКАНСКАЙ КАРЦІНЕ

ЛЕЙТЭНАНТ РЫЛЕЙ

(Прыгоды ў САН-ФРАНЦЫСКА).

Рэжысэр ЭДУАРД КЛЕЙН.

Труназыя з ымкі Джэкі МЕКЭНЗІ

Звыш праграмы кіно хроніка *„Совкино“ №14.*

РАСКЛАД СЭАНСАЎ:

ДЗЕННЫЯ: Пачатак 1-га сэансу а 1 г. 30 м. 2-га а 3 гадз. На дзенныя сэансы ўсе білеты па 25 кап. Каса адчынена ад 12 г. дня

ВЯЧЭРНІЯ: Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. 2-га а 7 гадз. 30 м. 3-я а 9 гадз. 4-га а 10 г. 30 м. Каса адчынена ад 5 гадз.

ОРГСТРОЙ

У зьвязку з наступленьнем другога навучальнага году 1929-30 г. БЕЛАРУСКАЙ КАЛГОСНАЙ

„ОРГСТРОЙ“

атрыманы поўны асартымэнт

абсталяваньня для каліброўкі.

Пераход на каліброўкі мясцовых і мытнягодны з 1-га чысла кожнага месяца выдаткі на абсталяваньне значна меншыя чым пры кніжнай форме бухгальтэрыі, пераход на каліброўкі гарантуе тахнічны ажур, яскравасьць і чоткасьць і дае эфект на прадпрыемствах гаг дзёвых, вытворчых і інш., а таксама у адміністрацыйных установах, якія знаходзяцца на дзяржбюджэце

Заказы накіроўваць на адрасах: «ОРГСТРОЙ»—г. Менск, Савецкая 55. Магазын «ОРГСТРОЙ»—г. Менск, пляц Волі 5

Агенцтвы: у г. Гомелі—Савецкая, 17, у г. Віцебску—Ленінская, 49.

Беларуская Дзяржаўная Акадэмія Сельскае Гаспадаркі

АБВЯШЧАЕ:

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на паступленьне ў Акадэмію **ПРАЦЯГНУТ да 5-га красавіка г. г.**

Іспыты пачнуцца 1-11/-30 г.

Правіла прыёму зьмешчаны у газэце «Зьвязда» № 17 і 18 сакавіка г. г.

Рэктар Акадэміі ПІНЧУК П. І.

АБВЕСТКА.

ДА УВАГІ жыхароў муніцыпалізаваных дамоў.

Спажывецкія агароды, знаходзячыяся пры ўнёў муніцыпалізаваных дамох Камгасам перадаюцца ў калектыўнае карыстаньне працоўных, пражываючых у гэтых дамох.

ЖЫХАРЫ ДОМУ,

жадаючыя ўдзелічаць у апрацоўцы агародаў,

павінны БЕЗАДКЛАДНА зарэгістравацца ў Зямельнай Частцы Камгасу.

У выпадку, калі ў апрацоўцы агародаў некаторыя жыхары дому ўдзельнічаць адмаўляюцца, жадаючыя карыстацца агародам павінны прадставіць пісьмовую **заяву за подпісам адмовіўшыхся.**

Агароды, якія жыхарамі ня будуць замацаваны за сабой **да 10-га красавіка г.**, Зямельнай Часткай Камгасу будуць перададзены пад апрацоўку іншым калектывам.

Там дзе пры доме акрамя агароду есьць САДЫ, гэтыя сучесныя з агародамі будуць САДЫ гэтыя сучесныя з агародамі будуць Зямельнай Часткай Камгасу перадаваца ў аренду Аднадзвор Частка Камгасу пераважна жыхарам працоўных, жыючым у даным доме.

Аб здачы ёмкоў у аренду павінны падавацца заявы, таксама з заведкамі адносна адмаўляючыхся ўдзельнічаць у арэндзе.

Сады на аренду якіх ад жыхароў на будуць атрыманы заявы да 15 красавіка, будуць Камгасам здадзены ў аренду а таргоў.

МЕНКАМГАС.

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА.

1. М. САВІЦКІ, П. ТРУС.

ВАЛНА ЯК УГНАЕНЬНЕ. Стар. 56. Цана 35 кап.

2. Праф. П. М. БЯЛЯНЧЫКАЎ.

ТРАКТАРНЫЯ ПРЫЧЭПКІ. Стар. 56. Цана 40 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Пасьпяшэцеся СЁНЬНЯ-Ж падпісацца на газэту **„ЗЬВЯЗДА“** **на КРАСАВІК** і да канца **1930 году,** каб ня было перапынку ў атрыманьні газэты **з 1-га КРАСАВІКА.**

Менская Акруговая Ашчаднаса дапаможыць да нядзеннага ўкладчыку, што в пірчыны складаньня шматгадовай справаздачы **будуць спынены апэрацыі** Ґрэс. 31 САКАВІКА

ПРАДАЮЦЦА радыё-прыёмнік „ПЛ[illegible]“ (двухзмпавы) і рэпрадуктар «РЭКОРД». Адрас: [illegible] вул. № 11, кв. [illegible], КАГАН глядзець ад 8—10 гадз. веч.

ЗГУБЛ. ДОМОВАЯ КНІГА д. № 34 па Камунальнай [illegible] **Лічыць недасчоўнай.**